WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 САКАВІКА 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 54
(26662)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПРАШАЕ КІТАЙ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА МНОГІХ ПРАЕКТАХ АЖ ДА БУДАЎНІЦТВА АЭС

Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў учора на сустрэчы ў Мінску з намеснікам Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам, перадае БЕЛТА.

«Сёння за кітайскія сродкі мы рэалізуем у Беларусі праекты прыкладна на $1 млрд. Лічу, што гэты вектар мае патрэбу ў істотным пашырэнні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў даволі высокі ўзровень гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін: «Помню, некалі мы марылі дасягнуць тавараабарот у $500 млн, а сёння ў нас ужо ёсць амаль $2,5 млрд тавараабароту ў год».

Прэзідэнт падзякаваў кітайскаму боку за падтрымку Беларусі на міжнароднай арэне, а таксама за вялікую дапамогу, што аказваецца ў галіне эканомікі і фінансаў. Гаворачы аб палітычных пытаннях, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на падабенства пазіцый па асноўных пытаннях міжнароднага парадку дня, прычым у Беларусі і Кітая ніколі не было разыходжанняў па гэтых пытаннях.

Звяртаючыся да госця, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Сі Цзіньпін прыехаў «не проста ў дружалюбную краіну, а практычна на сваю радзіму». «Я гэта гавару не для таго, каб выклікаць прыхільнасць да сябе, сваёй краіны. Я асабіста знаёмы з КНР на працягу 20 гадоў і вельмі добра ведаю, што ўсходнія людзі, асабліва кітайцы, вельмі асцярожныя, але калі ідуць насустрач, то гэта назаўсёды», — адзначыў Прэзідэнт. «Мы сапраўды вельмі доўга прыглядаліся адзін да аднаго, асабліва Кітай вывучаў нашу краіну, палітыку, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Але ўсё тое, што зрабіў Кітай за апошнія 3-5 гадоў, і дае магчымасць сёння сказаць, што вы прыехалі ў сваю рэспубліку».

Кіраўніцтва КНР высока ацэньвае антыкрызісную палітыку Беларусі. Аб гэтым заявіў намеснік Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін. «Нягледзячы на сусветны фінансава-эканамічны крызіс, у Беларусі ўдаецца захаваць палітычную стабільнасць, эканамічны рост і павышэнне дабрабыту насельніцтва, — адзначыў высокі госць. — Гэта значыць, што мы дасягнулі поспехаў у процідзеянні наступствам сусветнага крызісу». Паводле слоў намесніка Старшыні КНР, Аляксандр Лукашэнка — «вялікі сябар кітайскага народа». «Мы заўсёды з пільнай увагай сачылі за вашымі крокамі па развіцці беларускай эканомікі і высока ацэньваем поспехі краіны, дасягнутыя ў нядаўнім часе», — сказаў Сі Цзіньпін.

Ён павіншаваў Прэзідэнта з поспехамі беларускай каманды на зімовых Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы. У адказ Аляксандр Лукашэнка пажартаваў: «Гэта добра, што ў Кітаі не так развіты зімовыя віды спорту, а то ніхто б акрамя вас нічога не змог бы на іх заваяваць. Але мы ўсё роўна за вас балеем, мы балелі за вас на летніх Алімпійскіх гульнях — не чужыя ж нам людзі».

Сі Цзіньпін таксама адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі ўдзельнічаў у цырымоніі адкрыцця Алімпійскіх гульняў у Пекіне ў 2008 годзе. «Мы лічым, што гэта сведчыць аб вашай падтрымцы кітайскай дзяржавы», — сказаў намеснік Старшыні КНР.

Беларусь разлічвае на зніжэнне Ашчадным банкам Расіі працэнтных ставак па крэдытах для рэальнага сектара беларускай эканомікі

Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы са старшынёй праўлення Ашчаднага банка Расіі Германам Грэфам, перадае БЕЛТА.

У прыватнасці, ён падкрэсліў, што атрыманыя ад Ашчаднага банка рэсурсы ў аб'ёме 6 млрд расійскіх рублёў сёння эфектыўна працуюць на эканоміку Беларусі.

Павышаюцца цэны на звадкаваны газ

Міністэрства эканомікі Беларусі павысіла з 25 сакавіка гэтага года адпускныя цэны на звадкаваны газ у дачыненні да дзеючага ўзроўню на 7,3 — 10 %, паведамляе БЕЛТА.

Наталля Пяткевіч раскрытыкавала неразваротлівасць і няўзгодненасць у рабоце спартыўных чыноўнікаў і нацыянальных федэрацый

Алімпійскі чэмпіён Ванкувера Аляксей Грышын будзе атрымліваць імянную прэзідэнцкую стыпендыю ў памеры 200 базавых велічыняў, што складае 16 мільёнаў 200 тысяч рублёў. Пра гэта паведамілі ўчора на сумеснай калегіі Міністэрства спорту і турызму і НАК, дзе падводзіліся вынікі выступлення зборнай Беларусі на зімовых Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы. Фрыстайліст будзе атрымліваць імянную стыпендыю з 25 лютага 2010 года па 24 лютага 2014 года. Такая ж стыпендыя прызначана і галоўнаму трэнеру каманды Мікалаю Казеку. Стыпендыі ў памеры ад 100 да 150 базавых велічыняў атрымаюць таксама фрыстайлістка Асоль Слівец (за чацвёртае месца на Алімпіядзе), трэнер каманды Васіль Вараб'ёў, біятланісты Дар'я Домрачава і Сяргей Новікаў, а таксама трэнеры зборнай Аляксандр Папоў, Адрыян Цыбульскі і Юрый Альберс.

Нягледзячы на тое, што зімовыя Алімпійскія гульні ў Ванкуверы сталі самымі паспяховымі ў суверэннай гісторыі Беларусі, і ўпершыню беларус стаў зімовым алімпійскім чэмпіёнам, відавочным стаў шэраг праблем. Першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч папрасіла прысутных засяродзіцца менавіта на праблемах, прааналізаваць вынікі і правесці працу над памылкамі. У прыватнасці, яна падкрэсліла, што ва ўсіх астатніх відах спорту, акрамя біятлона і фрыстайла, спартсмены не выканалі плановых заданняў. Яна раскрытыкавала неразваротлівасць і няўзгодненасць у рабоце спартыўных чыноўнікаў і нацыянальных федэрацый. Наталля Пяткевіч выказала недаўменне, што ўсе ківаюць адзін на аднаго і нельга вызначыць, хто ж нясе адказнасць за пралікі.

Шмат нараканняў выклікалі канькабежны спорт і лыжныя гонкі. «Галоўны трэнер зборнай па канькабежным спорце Ігар Пагарэлаў проста «затузаў» Святлану Радкевіч пагрозамі замены на Анжаліку Кацюгу, у камандзе па лыжных гонках проста агіднае псіхалагічнае становішча. Галоўны трэнер каманды толькі ў лістападзе выслаў на Міністэрства спорту і турызму больш за 40 факсаў аб змене праграмы збораў. На Алімпіядзе Леанід Карніенка пераблытаў павароты трасы і не туды звярнуў, хоць мог прыйсці першым усі другім і прэтэндаваць на фінал», — прывёў прыклады намеснік міністра спорту і турызму Дзмітрый Шычко. У той жа час ён нагадаў, як выдатная арганізацыйная праца ў камандзе па фрыстайле дазволіла Асоль Слівец вярнуцца пасля нараджэння дзіцяці ў спорт і заняць чацвёртае месца ў фінале, а Ала Цупер з траўмай (зламанай лапаткай) да апошняга вяла барацьбу. Выступленне лыжніка Сяргея Далідовіча выклікала таксама бурнае абмеркаванне. У прыватнасці, дзяржтрэнер Мікалай Манкевіч выказаў незадаволенасць, што спартсмен самастойна выбіраў праграму збораў і спаборніцтваў, у прыватнасці, незадоўга да Алімпіяды наведваў Мончагорск і Барнаул.

Навошта Далідовіч наведваў Барнаул, растлумачыў старшыня Федэрацыі лыжных гонак Аляксандр Паўлоўскі: «Усе ведаюць, што Далідовіч у Барнауле хаваўся». Трэба меркаваць, ад кантролю? Старшыня федэрацыі нагадаў, што ўся жаночая каманда па лыжных гонках адмаўлялася падпісваць кантракт з Мінспорту, спартсменак не задавальнялі фінансавыя ўмовы. Аляксандр Паўлоўскі прызнаў нездавальняючым работу трэнерскага штаба і федэрацыі лыжных гонак і паведаміў, што напісаў заяву аб адстаўцы. Услед за ім адстаўка чакае і ўвесь трэнерскі штаб каманды. Вынікі выступлення на Алімпіядзе ў канькабежным спорце таксама прызнаныя нездавальняючымі. У планавым заданні значылася заваяванне аднаго ачка, і на падрыхтоўку было затрачана каля трох мільярдаў рублёў. Наталля Пяткевіч падкрэсліла, што на падрыхтоўку спартсменаў затрачваюцца каласальныя бюджэтныя сродкі, а спартсменам не хапае элементарнага — дысцыпліны.

Былі ўзнятыя на калегіі і праблемы дзіцяча-юнацкага спорту. У прыватнасці, усе спецыялісты і дзяржтрэнеры казалі пра недастатковую, а часам і катастрафічную вучэбна-матэрыяльную базу дзіцячых спартыўных школ. Акрамя адсутнасці інвентару (у лыжных гонках, напрыклад, школы забяспечаныя ім не больш чым на 20 працэнтаў, паводле слоў Аляксандра Паўлоўскага), не хапае і дзіцячых трэнераў. Заработная плата маладых спецыялістаў — 400-450 тысяч. Праўда, паводле прызнання дзяржтрэнераў, былыя спартсмены не паедуць у раёны дзіцячымі трэнерамі і за тысячу долараў.

Алена КРАВЕЦ.

«ЗАМАБІЛЕНЫ» ЗЛАДЗЮЖКА

26-гадовага мінчаніна злавілі за руку з 30 выкрадзенымі мабільнымі тэлефонамі.

Паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, злодзею не пашанцавала, бо на яго шляху патрапіліся пільныя супрацоўнікі 9-й роты патрульна-паставой службы міліцыі ГУУС Мінгарвыканкама. Апошнія на частцы маршруту, што праходзіла побач з тэрыторыяй гандлёвага дома «Ждановічы», звярнулі ўвагу на падазронага чалавека, які корпаўся ля агароджы рынку. Мужчына перацягваў праз плот пакет, а калі ўбачыў праваахоўнікаў, то кінуў яго на зямлю, а пасля пачаў запіхваць назад за плот. Каб высветліць, што ж насамрэч адбываецца, супрацоўнікі міліцыі затрымалі мінчука. Як выявілася, пакет быў набіты мабільнымі тэлефонамі: канфіскавана 30 тэлефонаў розных мадэляў, а выкраў іх зладзюжка з аднаго з павільёнаў рынка.

Ігар ГРЫШЫН.

Сталіца крочыць за МКАД

Сяргей ГРЫБ

Нягледзячы на пэўныя эканамічныя цяжкасці, сёлета Мінск мае намер выканаць усе прагнозныя паказчыкі развіцця, прычым чакаецца, што ўжо па выніках I квартала сярэдняя зарплата па найбуйнейшым горадзе краіны павялічыцца на 7 працэнтаў. Пра гэта падчас сустрэчы з журналістамі паведаміў выканаўца абавязкаў старшыні Мінгарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГАЛОЎНАЯ ПРАБЛЕМА — МАЗ

Як паказаў пачатак года, у цэлым сталіца забяспечвае прырост паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Разам з тым, агульныя для ўсяго свету праблемы не абышлі бокам і Мінск, а асабліва няпростая сітуацыя склалася на МАЗе — сёлета аб'ём вытворчасці прадпрыемства складае прыкладна 70 працэнтаў ад узроўню I квартала мінулага года. Прычым МАЗ — завод асаблівы. Дастаткова сказаць, што тут працуе каля 28 тысяч чалавек.

— Магчыма, галоўнай для буйных гарадоў сапраўды з'яўляецца сфера паслуг, але таксама не сакрэт: наводная сталіца ў свеце не адмаўляецца ад буйной вытворчасці, — адзначыў в.а. мэра. — І выйсце для прамысловасці, і ў прыватнасці, для МАЗа — развіццё рэгіянальных эканамічных сувязяў. Нам удаецца адшукаць новыя кантракты на пастаўку тэхнікі — у Туркменістан, Азербайджан, Малдову, Венэсуэлу. Таму мы спадзяёмся: сёлета завод усё ж здолее выйсці на ўзровень «дакрызіснага» 2008 года. Гэта задача складаная, але яе трэба вырашыць — тым больш што на МАЗе «завязана» работа многіх прадпрыемстваў краіны.

Дарэчы, выхад на знешнія рынкі — пытанне актуальнае для ўсіх. Адзін з прыкладаў. На працягу апошніх гадоў сталіца практычна закончыла аднаўленне свайго трамвайна-тралейбуснага парка, у хуткім часе тое ж зробяць і абласныя цэнтры. Надалей патрэба ў гэтай тэхніцы будзе мінімальнай, магчыма, за выключэннем новых распрацовак — трамваяў, падобных на хуткасныя цягнікі. Адпаведна, для айчыннага вытворцы трамваяў і тралейбусаў, прадпрыемства «Белкамунмаш», застаецца адзін варыянт — экспарт. Таму толькі летась завод спрабаваў знайсці сваю нішу ў 30 краінах і выйграў тэндары на пастаўкі ў Сербію, ва Украіну, у Расію. А цяпер разглядаюцца праекты стварэння сумесных прадпрыемстваў у Маскве, ва Украіне, у Германіі.

Разам з тым, Мікалай Ладуцька перакананы, што для паспяховага прасоўвання за мяжу неабходна больш актыўна выкарыстоўваць новыя шляхі. І ў прыватнасці, гаворка пра магчымасці міжнародных электронных пляцовак.

ШТО ЗРУШЫЦЬ ЧЭРГІ?

Не сакрэт, што стан эканомікі вызначае магчымасці вырашэння сацыяльных пытанняў. І ці не найбольш вострым з іх для сталіцы застаецца жыллё. Колькасць насельніцтва Мінска паступова набліжаецца да 2-мільённай адзнакі, і ў тым ліку за кошт міграцыі — скажам, летась на сталае месца жыхарства ў горад пераехала 25 тысяч жыхароў з іншых рэгіёнаў.

Наўрад ці ёсць сэнс нараканць на міграцыю — для мегаполісаў гэта з'ява тыповая. Аднак толькі ў якасці канстатацыі: сталіцы не хапае больш чым 200 тысяч кватэр. Толькі ў інтэрнатах пражывае каля 33 тысяч мінскіх сем'яў.

— Сітуацыя ўскладняецца тым, што за апошнія пяць гадоў сталіца практычна вычарпала запас інжынерна-транспартнай інфраструктуры, — адзначае Мікалай Ладуцька. — Для новых кварталаў, што ўзнікаюць фактычна ў чыстым полі, яе трэба стварацъ з нуля. Так, нам удалося правесці рэканструкцыю дзвюх цеплаэлектрастанцый, але для забеспячэння новабудоўляў цяплом і электраэнергіяй гораду неабходныя яшчэ дзве ЦЭЦ. І ўсё гэта — выдаткі выключна бюджэту.

Не менш складаная тэма — непасрэдна будаўніцтва жылля. У сувязі з гэтым, паведаміў в.а. мэра, у бліжэйшы час плануецца вярнуцца да сумеснага з Кітаем праекта па стварэнні новага завода па вытворчасці зборнага жалезабетону. Плануецца, што магутнасцяў завода хопіць на наступныя 20—25 гадоў.

Адначасова в.а. старшыні Мінгарвыканкама заўважыў, што ніхто не супраць прыцягнення да будаўніцтва жылля замежных кампаній — гэта практыка сусветная, да таго ж замежныя кампаніі робяць укладанні ў інфраструктуру, купляюць беларускую тэхніку і будматэрыялы. Зноў жа распаўсюджаная ў іншых краінах з'ява — і выкарыстанне пазыковых сродкаў. На думку Мікалая Ладуцькі, нічога страшнага тут няма — галоўнае, зрабіць дакладныя эканамічныя разлікі. Прычым пазыковая сістэма павінна паспрыяць вырашэнню не толькі жыллёвай, але і іншых праблем — напрыклад, з медыцынскім абслугоўваннем. Пакуль у бальніцах горада не хапае 1200 ложкаў. Гэта пытанне плануецца зняць прыкладна за 4 гады.

«ПРЫВАТНЫ СЕКТАР» ЦАЛКАМ НЕ ЗНІКНЕ

Пры супастаўляльнай колькасці жыхароў плошча Мінска ўдвая меншая, чым плошча Варшавы. Па сутнасці беларуская сталіца займае тэрыторыю, аднолькавую з 700-тысячнай Рыгай. А адсюль — і праблема залішняй «шчыльнасці». Можна сказаць нават больш: найбуйнейшаму гораду Беларусі не хапае земляў.

Тым часам, паведаміў Мікалай Ладуцька, цяпер заканчваецца пакет узгадненняў з рознымі інстанцыямі рашэння аб пашырэнні гарадскіх межаў. У склад сталіцы ўвойдуць вёскі Шчомысліца, Тарасава, Дзегцяроўка, Ельніца, Новы Двор, мегаполіс працягне свой выхад за МКАД. Прычым ужо налета за межамі кальцавой аўтадарогі пачнецца пракладка інжынерных камунікацый, а ў 2012 годзе ў новых мікрараёнах будуць здадзеныя ў эксплуатацыю першыя дамы.

Паралельна горад атрымае землі ў раёне Смалявічаў, Кургана Славы, Заслаўя, Лагойска для развіцця індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва — мяркуецца, што тут мінчане змогуць пабудаваць каля 12 тысяч дамоў. Пры гэтым не выключаецца варыянт падтрымкі такога будаўніцтва на ўмовах, аднолькавых для сельскай мясцовасці, — у тым ліку маецца на ўвазе льготнае крэдытаванне пад 1 працэнт гадавых.

Разам з тым, в.а. мэра падкрэсліў: сёння пытанне аб зносе ўсяго «прыватнага сектара» і будаўніцтве на гэтым месцы шматкватэрнікаў ўсярэдзіне МКАД ужо не стаіць так адназначна. Знос будзе праводзіцца выбарачна — пад патрэбу ў тых або іншых сацыяльных аб'ектах.

ПЕРСПЕКТЫЎНЫ НАПРАМАК — ГАТЭЛЬ

Мінск — перш-наперш сталіца, а, значыць, у любым выпадку горад, які будзе прыцягваць гасцей. Аднак тут узнікаюць свае нюансы. Паводле ўсіх стандартаў, зыходзячы з колькасці насельніцтва мегаполіс павінен мець як мінімум 10 тысяч гасцінічных месцаў. Але рэаліі іншыя: пакуль такіх месцаў усяго 4,5 тысячы.

Сёння, паведаміў Мікалай Ладуцька, для патэнцыйнага будаўніцтва гасцініц у Мінску вызначаныя каля 40 пляцовак. Але тут сталіца спадзяецца на інвестыцыі. Прычым в.а. мэра заўважыў: выйграе той, хто зацікавіцца прапановай хутчэй — праз некалькі гадоў «прагал» будзе запоўнены цалкам.

КІЁСК НЕ ВЕРНЕЦЦА

Рашэнне наконт камерцыйных шапікаў застанецца без змяненняў — чакаць іх вяртання не трэба. Як паведаміў Мікалай Ладуцька, у горадзе налічваецца больш за 2800 крамаў, так што праблем з набыццём тавараў узнікаць не павінна. Прычым гэта колькасць будзе ўзрастаць, у тым ліку, за кошт буйных гандлёвых цэнтраў. Нядаўна яшчэ адзін такі цэнтр адчыніўся ў Шабанах, а ў хуткім часе тое ж адбудзецца ў Чыжоўцы.

ПАД ПАРКІНГІ — ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ?

Рост горада заўсёды абвастрае праблемы з транспартам. Як нагадаў Мікалай Ладуцька, ужо зроблена транспартная развязка на вуліцы Кальварыйскай, распачатыя работы па вуліцы Маякоўскага. Праўда, будаўніцтва інфраструктуры «цягне» і дадатковыя нязручнасці — прыкладам з'яўляецца перакапаны праспект Дзяржынскага. Гэта звязана з будаўніцтвам метро, прычым планы тут застаюцца без зменаў: тры новыя станцыі ў напрамку раёнаў Паўднёвы Захад і Малінаўка павінны быць уведзеныя ў 2012-м, а яшчэ адна станцыя — у 2014 годзе. Адначасова за тыя ж чатыры гады на праспекце Дзяржынскага будуць пабудаваныя і тры транспартныя развязкі.

У сталіцы — 630 тысяч аўтамабіляў, і гэта лічба працягвае ўзрастаць. А адсюль — і цяжкасці з паркоўкамі. Па сутнасці найбольш распаўсюджаным выйсцем тут застаюцца двары, але гэта — варыянт для жыхароў зноў жа нязручны.

— На тэрыторыі сталіцы магчыма стварыць каля 250 тысяч месцаў для цывілізаванай паркоўкі аўтатранспарту, і работа ў гэтым напрамку вядзецца, — заўважыў Мікалай Ладуцька. — Але тут узнікае праблема: будаўніцтва месца ў паркінгу каштуе каля 10 тысяч долараў. Знайсці такія грошы большасці жыхароў цяжка, таму мы бачым ці не адзінае выйсце: зняць пытанне за кошт ільготнага крэдытавання. Прынамсі, разглядаць такі варыянт у дачыненні да сталіцы трэба.

З іншага боку, Мікалай Ладуцька паведаміў, што на разгляд Савета Міністраў уносіцца прапанова забараніць на заканадаўчым узроўні паркоўку грузавікоў у сталіцы ў дварах і ўздоўж дарог. Дазволіць такую паркоўку плануецца толькі на свабоднай тэрыторыі прадпрыемстваў або на іншых тэрыторыях, якія фактычна нікім не выкарыстоўваюцца.

У Бабруйску і Ашмянах паводка падтапіла жылыя дамы і падворкі

Як паведамілі рэдакцыі ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры, крыгаход пачаўся на Прыпяці ў раёне вёскі Чэрнічы, ніжэй па цячэнні ракі, а таксама на Заходняй Дзвіне, Дняпры, Сажы і Бярэзіне.

Мацней за ўсё «вялікая вада» прыбывае на рэках Віхра (прыток Сажа) і Ула (прыток Заходняй Дзвіны), дзе яе ўзровень за суткі павялічваецца на 93—116 сантыметраў. На Прыпяці каля Любанскага моста і вёскі Чэрнічы, на Ясельдзе побач з вёскай Сенін і Свіслачы каля вёскі Церабуты ўзроўні вады перавышаюць небяспечныя адзнакі ўжо на 4—78 сантыметраў. На Прыпяці каля Петрыкава, на прытоку Случы побач з вёскай Ленін і на Пцічы ў вёсцы Лучыцы да небяспечных узроўняў паводкі засталося 6—8 сантыметраў.

Пасля актыўнага разліву ракі Бабруйка ў Бабруйску, ракі Любанька ў Кіраўскім раёне ў вёсцы Гута і ракі Ашмянка ў Ашмянах былі падтопленыя жылыя дамы, падворкі і гаспадарчыя пабудовы.

Гідролагі прагназуюць, што ў найбліжэйшыя дні пачнецца крыгалом на Прыпяці (на ўчастку Петрыкаў — Мазыр), Сажы (на ўчастку Крычаў — Слаўгарад), Бярэзіне.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЗС ЧЭХІІ: РАСІЯ І ЗША ПАДПІШУЦЬ НОВУЮ ДАМОВУ СНВ У ПРАЗЕ

Расійска-амерыканская дамова па абмежаванні стратэгічных і наступальных узбраенняў (СНУ), відаць, будзе падпісана ў Празе, паведамляецца са спасылкай на Міністэрства замежных спраў Чэхіі. У распаўсюджанай у сераду заяве знешнепалітычнага ведамства гаворыцца, што адміністрацыя ЗША звярнулася да чэшскіх уладаў з просьбай арганізаваць у Празе цырымонію падпісання дамовы. У Крамлі гэту інфармацыю каментаваць адмовіліся. Пра пэўную дату падпісання дамовы чэшскім дыпламатам пакуль невядома.

Нагадаем, у сакавіку расійскі бок прапанаваў у якасці месца для падпісання дакумента Кіеў. З такой прапановай выступіў новы ўкраінскі прэзідэнт Віктар Януковіч. Як паведаміў міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў, Масква была б рада прыняць гэта запрашэнне Януковіча. Дамова па СНУ, праца над якой завяршаецца на расійска-амерыканскіх перамовах у Жэневе, прыйдзе на змену Дамове СНУ-1, тэрмін дзеяння якой мінуў 5 снежня 2009 года. Новая дамова прадугледжвае радыкальнае скарачэнне з абодвух бакоў носьбітаў у межах ад 500 да 1100 адзінак, і злучаных з імі боегаловак — ад 1500 да 1675 адзінак.

Нагадаем, што раней у якасці месца падпісання дамовы называліся Прага, Кіеў і Вашынгтон.

У ЛІТВЕ ВЫРАШЫЛІ АДМОВІЦЦА АД ПРЫВАТЫЗАЦЫІ ЛЯСОЎ

Маштабная прыватызацыя дзяржаўных лясоў у Літве не адбудзецца. Такое рашэнне вынес парламенцкі камітэт па ахове прыроды.

Раней абмеркаванне гэтага пытання прайшло ў Акадэміі навук краіны, дзе ў прапановы пра перадачу лясоў у прыватныя рукі не знайшлося прыхільнікаў. Ініцыятыва таксама была негатыўна сустрэта грамадскасцю. У выпадку калі б ініцыятыва прыхільнікаў рынкавых рэформаў была ўхвалена, у руках прыватных уладальнікаў маглі б апынуцца 72 працэнты дзяржаўных лясоў Літвы, а за дзяржавай засталіся б замацаванымі толькі нацыянальныя паркі і запаведнікі. Пры гэтым для збору грыбоў і ягад у прыватным лесе неабходна было б атрымліваць дазвол ва ўладальніка ляснога масіву.

Прыватная ўласнасць на лясныя ўгоддзі дзейнічае ў іншых прыбалтыйскіх рэспубліках — у Латвіі і Эстоніі. У выніку гэтага трэць латвійскіх лясоў у наш час належыць замежнікам. У шматлікіх прыватных лясах займацца зборам грыбоў і ягад можна толькі за плату.

У ГЕРМАНІІ АСУДЗІЛІ БАНДУ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Мюнхенскі суд прысудзіў да турэмных тэрмінаў банду нямецкіх пенсіянераў, якія абвінавачваліся ў выкраданні закладніка і нанясенні яму калецтваў.

Абвінавачанымі па справе былі дзве шлюбныя пары ва ўзросце ад 61 да 79 гадоў, якія страцілі амаль паўтара мільёна долараў з-за фінансавага крызісу. Спрабуючы вярнуць грошы, яны выкралі свайго фінансавага кансультанта, амерыканца Джэймса Эмберна. Саўдзельнікам па справе выступаў немец Вільгельм Д., былы падначалены Эмберна, якому той, паводле яго слоў, завінаваціўся 690 тысяч долараў.

Падчас судовага працэсу ўсе чацвёра пенсіянераў прызналі сваю віну. Правадыр хеўры, 74-гадовы Роланд К., у чыёй хаце ўтрымліваўся закладнік, быў асуджаны да шасці гадоў турмы. Яго 79-гадовая жонка атрымала паўтара года ўмоўна. Другую пенсіянерку прысудзілі да 21 месяца ўмоўна, а яе мужу, 67-гадоваму Герхарду Ф., прысуд пакуль не абвясцілі, бо ён не змог з'явіцца ў суд па стане здароўя.

Па звестках следства, двое пенсіянераў напалі на свайго кансультанта ў яго хаце ў Шпеіры, звязалі яго, заляпілі рот скотчам, запхнулі ў скрынку і, даставіўшы на калясцы да машыны, запіхнулі ў багажнік. У ахвяры зламаныя два рэбры.

Джэймс Эмберн правёў у палоне ў нямецкіх старых чатыры дні. За гэты час выкрадальнікі сілай вымусілі яго падпісаць распараджэнне пра перавод з яго рахунка ў банку ў Цюрыху 2 мільёнаў еўра, не падазраючы пра тое, што грошай на рахунку амерыканца, збяднелага ў выніку фінансавага крызісу, няма. На чацвёрты дзень зняволення Эмберну атрымалася адправіць у банк па факсе запіску з просьбай аб дапамозе, неўзабаве пасля чаго яго вызваліла паліцыя.

Прамая лінія

АД ПЕНСІІ ДА ДАПАМОГ

Адрасная сацыяльная дапамога, пенсіі, падтрымка ветэранаў, выплаты да 65-годдзя Перамогі — усё гэта стане тэмамі «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! **Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» пройдзе 5 красавіка з 12 да 13 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.**

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗАГІНУЎ ЖЫВЁЛАВОД

23 сакавіка ў вёсцы Далговічы Мсціслаўскага раёна на малочнатаварнай ферме СВК «Усход» загінуў 32-гадовы мужчына.

Паводле інфармацыі Магілёўскага абласнога УМНС, абвалілася ўнутраная цагляная перагародка, якая аддзяляла тэхнічнае памяшканне ад уласна фермы. Жывёла не пацярпела. Расследаванне па факце гібелі чалавека на вытворчасці праводзіць пракуратура Мсціслаўскага раёна.

Ілона ІВАНОВА.

ЗВОЛЬНЕНЫ РАБОТНІК УКРАЎ У БЫЛОГА ГАСПАДАРА ПРАДУКЦЫІ НА 10 МІЛЬЁНАЎ

40-гадовы мужчына, які працаваў грузчыкам у прадпрымальніка, любіў заліць за каўнер, за што ўрэшце і быў звольнены бізнэсменам.

Паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, ён затаіў крыўду за гэта на свайго наймальніка, а праз некалькі дзён і адпомсціў. Між іншым, да свайго звальнення мужчына паспеў зрабіць дублікат ключа ад кіёска на ждановіцкім рынку, у якім знаходзілася бакалея. Вось да яго ўначы і «прыблукаў» падазроны, шукаючы «сатысфакцыі»: выкраўшы адтуль прадукцыі на 10 мільёнаў, ён вывез яе на аўтамабілі знаёмага, пасля чаго частку прадаў, а частку з'еў сам. Затрымалі зламысніка праз некалькі дзён пасля ўчыненага, і цяпер ён знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

ЯК НАС ДУРАЦЬ

ПЕНСІЯНЕРКУ АБАКРАЛІ МАХЛЯРКІ, ЯКІЯ ЗАЙШЛІ Ў КВАТЭРУ ПАД ВЫГЛЯДАМ «БЕЖАНАК»

У сваю кватэру на сталічнай вуліцы Волаха, паведамляе прэс-афіцэр Маскоўскага РУУС Таццяна Грыб, старая жанчына ўпусціла дзвюх незнаёмак, купіўшыся на іх «легенду»: прайдзісветкі, калі гаспадыня адчыніла дзверы на званок, распавялі апошняй пра свой цяжкі лёс, маўляў, яны бежанкі і моцна замерзлі. І са слязьмі на вачах пачалі прасіць пенсіянерку напаіць іх гарачай гарбатай.

Разлік нахабніц апраўдаўся, бо старая не толькі ім паспачувала, але і павяла на кухню, дзе і гарбатай пачаставала, і накарміла. Праўда, гэта не расчуліла нахабніц, якія насамрэч заявіліся, каб абакрасці сваю ахвяру. А таму адна з махлярак пайшла нібыта ў прыбіральню і зачыніла за сабой дзверы кухні. Калі ж вярнулася, то абедзве госці раптоўна зазбіраліся на выхад. Гаспадыня правяла візіцёрак і толькі пасля выявіла, што ў пакоях кавардак — шафы расчыненыя, а рэчы раскіданыя. Разам з невядомымі з хаты знікла больш за паўмільёна рублёў і заручальны пярсцёнак, які пенсіянерка захоўвала доўгія гады. Вось такім чынам прайдзісветкі, якіх цяпер расшуквае міліцыя, аддзячылі жанчыне за даверлівасць і дабрыню...

Ігар ГРЫШЫН.

ЗА ЗАБОЙСТВА ПЕНСІЯНЕРКІ — 20 ГАДОЎ ТУРМЫ

У в. Навасёлкі Ляхавіцкага раёна ў кастрычніку 2009 года была забітая пенсіянерка.

29-гадовая жанчына залезла ўначы праз акно ў хату да састарэлай, каб украсці пенсію. Калі грошай не знайшла, то качалкай забіла гаспадыню і прыхапіла з сабой тканіны і прадуктаў на 43 і прыкладна 2 тысячы рублёў. Суд прыгаварыў забойцу да 20 гадоў пазбаўлення волі і прымусовага лячэння ад алкагалізму.

137 МІЛЬЁНАЎ ДАВЯДЗЕЦЦА ВЯРНУЦЬ

Былы дырэктар музычнай школы ў Баранавічах здолеў пазычыць шляхам ашуканства 137 млн рублёў. Мужчына пазычаў грошы пад рознымі падставамі, для яго людзі афармлялі на сваё імя крэдыты.

На судзе былі даказаны 14 эпізодаў ашуканства, і былога дырэктара адправілі на 4 гады ў калонію ўзмоцненага рэжыму. Маёмасць асуджанага канфіскавалі. Абласны суд прыгавор пакінуў у сіле.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У ПАЎФІНАЛЕ КУБКА — БЕЗ СЕНСАЦЫЙ

Учора прайшлі першыя матчы паўфіналу Кубка Беларусі. На штучным газоне КФП «Мінск» сустракаліся БАТЭ і салігорскі «Шахцёр». Сустрэча завяршылася перамогай барысаўчан 2:1. БАТЭ адкрыў лік на 25-й хвіліне — Аляксандр Алумона рэалізаваў пенальці за гульню рукой. На 61-й хвіліне Дзмітрый Бага забіў другі мяч. На 77-й хвіліне падапечныя Эдуарда Малафеева скарацілі разрыў. З такім жа лікам завяршыўся і другі матч паўфіналу. Жодзінскае «Тарпеда» перамагло гомельскі ДСК. Матчы ў адказ адбудуцца ў нядзелю, 28 сакавіка.

Алена КРАВЕЦ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)
ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЗПИ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом здания складского корпуса, об. пл. 3565,0 кв.м; здания контрольно-пропускного пункта, об.пл. 18,0 кв.м, расположенных по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Даумана, д. 97. Начальная цена с НДС – 2 644 378 754 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,5973 га. Задаток в сумме 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже объекта республиканской собственности – изолированного помещения

Лот № 1. Предмет аукциона, сведения о предмете аукциона, место нахождения имущества	**Изолированное помещение инв. № 410/D-17948** (изолированное нежилое помещение пл. 56,5 кв. м, расположено в одноэтажном нежилом здании, постройки до 1945 г., наружные и внутренние капитальные стены – шлакоблочные, внутренние перегородки – кирпичные, крыша – двухскатная, шиферная, полы – плитка, линолеум, бетон, **расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г.п. Россь, ул. Советская, 15**
Начальная цена предмета аукциона – 17 766 697 руб., сумма задатка – 1 776 000 руб.	
Условия продажи недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственную деятельность в течение одного года с момента заключения договора купли-продажи, создание не менее двух рабочих мест	
Продавец недвижимого имущества: Республиканское унитарное сельскохозяйственное предприятие по племенному делу «Племзавод «Россь», контактные телефоны: (8 01512) 3 25 47, 3 03 07, 3 22 57	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)	

1. Аукцион состоится **29 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 23 апреля 2010 года до 16.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

- юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

- иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международная организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

- представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

- представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность;

- при подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность; руководителю юридического лица просьба иметь документ, подтверждающий его полномочия.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. Аукцион по конкретному предмету торгов признается нерезультативным, если в результате торгов данный объект не был продан в порядке, установленном законодательством, кому-либо из участников торгов.

Аукцион по конкретному предмету торгов признается несостоявшимся, если торги не состоялись в связи с отсутствием участников торгов либо наличием только одного участника.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

9. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов возместить фактические затраты на организацию и проведение торгов; после предъявления копии платежных документов о перечислении затрат в республиканский бюджет в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2-х рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

10. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

11. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.

ПАЧАЛІ З ДВУХ АВЕРТАЙМАЎ

Вечарам аўторка на крытым катку ў сталічным парку Горкага гульнёй паміж мінскім «Юнацтвам» і салігорскім «Шахцёрам» стартавала фінальная серыя адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакею.

Сталічны клуб сёмы раз запар даходзіць да фіналу чэмпіянату Беларусі, а вось «гарнякі» ўжо ўвайшлі ў гісторыю як першая каманда, якая дабралася да такіх вышынь у дэбютны год свайго існавання. Наогул, салігорская каманда носіць статус фарм-клуба мінскага «Дынама», і сярод яе гульцоў нямала тых, хто паспеў пагуляць і ў складзе нашага адзінага прадстаўніка ў КХЛ. Напрыклад, пачыналі сезон у «белаблакітнай» форме Андрушчанка і Развадоўскі, на працягу ўсяго года гулялі за «зубраў» Кулакаў, Чупрыс, яшчэ некалькі хакеістаў.

Дадатковую інтрыгу можна пабачыць таксама ў прынцыповым супрацьстаянні трэнераў. Міхаіл Захараў (які, дарэчы, аб'явіў часовы байкот прэсе) супраць Андрэя Гусава. Іх шляхі перасякаліся яшчэ ў той час, калі апошні ўзначальваў «Керамін». І тады паядынкі гэтых дзвюх каманд заўсёды вызначаліся напружанай барацьбой.

Шмат нервовых клетак спалілі гледачы і ў першым паядынку серыі. Лік адкрылі госці — на 16 хвіліне стартавага перыяду вызначыўся Аляксей Страхаў, аднак на гэтай жа 16 хвіліне, праўда, другой дваццаціхвілінкі, украінскі легіянер «Юнацтва» Аляксандр Мацярухін аднавіў раўнавагу. Хто б у гэты момант мог падумаць, што наступнага ўзяцця варот прыйдзецца чакаць... 52 хвіліны! Толькі ў другім авертайме (у фінале пры нічыйным ліку адзін за адным прызначаюцца авертаймы па 20 хвілін да першай закінутай шайбы) доўгачаканую перамогу сваёй камандзе прынёс «гарняк» Віктар Андрушчанка. 2:1 і «Шахцёр» павёў у серыі 1:0.

Другая гульня серыі прайшла ўчора вечарам, але скончылася, на жаль, пасля падпісання нумара ў друк. Падрабязнасці заўтра.

Яўген ВАРАКСА

Фота Пятра ФАМІНА.

ТАНЦЫ ПАД КАЙФАМ

Праваахоўнікамі затрыманыя двое вядомых і папулярных у дыскатэчным асяроддзі дыджэяў.

Супрацоўнікі міліцыі ўпэўненыя, што 28-гадовы і 32-гадовы падазроныя ўдзельнічалі ў рэалізацыі псіхатропных рэчываў на некалькіх сталічных дыскатэках. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, затрыманне па месцы жыхарства згаданых дыджэяў стала завяршаючым этапам аператыўных мерапрыемстваў па выяўленні і спыненні распаўсюджання псіхатропных рэчываў у моладзевых забаўляльных установах Мінска. У інтарэсах следства імёны падазроных не называюцца. Пакуль жа паведамляецца пра тое, што ў кожнага з падазроных былі пастаянныя спажыўцы экстазі, у тым ліку і сярод кліентаў забаўляльных устаноў. Адна такая таблетка для кайфу ў гандляроў каштавала 10 долараў ЗША. Між іншым, пры затрыманні ў дыджэяў было канфіскавана 350 таблетак экстазі. У адносінах да аднаго з падазроных ужо ўзбуджаная крымінальная справа. Аляксандр Ластоўскі таксама адзначыў, што з пачатку гэтага года ў сталіцы раскрыта больш за дзясятак злачынстваў, звязаных з распаўсюджваннем зелля ў розных моладзевых установах.

Ігар ГРЫШЫН.

Абзац

◢ Трыццацігадовы памочнік машыніста лакаматыўнага дэпо станцыі Віцебск загінуў у Смаленску (Расія), рамантуючы рухавік цеплавоза. Падчас руху лакаматыва грузавога цягніка па маршруце Віцебск — Смаленск у дэпо Смаленска здарылася непаладка, і машыніст цеплавоза для высвятлення прычыны і запуску дызеля накіраваў памочніка. Пасля запуску дызеля малады чалавек не вярнуўся ў кабіну і не адказваў на выклікі па радыёсувязі, таму машыніст спыніў цягнік, каб высветліць, што адбылося. Падчас агляду дызельнага памяшкання ў раёне галоўнага генератара быў знойдзены памочнік машыніста без прыкмет жыцця, ён ляжаў на масніцах. Фельчар медпункта канстатаваў смерць. Пры аглядзе цела выяўлена рвана-выцятая рана ў вобласці шыі. Мяркуецца, што траўма была атрымана ў выніку ўдару адарваным часткі шпількі мацавання клапаннай каробкі аднаго з цыліндраў рухавіка. Адарвацца яна магла з-за гідраўдару. Абставіны здарэння высвятляюцца.

Поўны абзац

◢ **У Хмельніцкай вобласці (Украіна) умудрыліся скрасці цэлы сад яблыняў. У сяле Грынчук Камянец-Падольскага раёна невядомыя выкапалі з зямлі 840 маладых саджанцаў яблыні. Гэта адбывалася на працягу трох сутак. Кошт кожнага саджанца складае ў сярэднім прыкладна 50 грыўняў (1 грыўня роўная Br374).**

◢ У Кіеве з наступленнем вясны вырашылі правесці акцыю з арыгінальнай назвай «Свіння за рулём». Акцыя накіраваная супраць нядобрасумленных вадзіцеляў, якія паркуюць свае машыны на газонах. Згодна з разлікамі спецыялістаў, аўтамабіль, які чатырма коламі заехаў у зялёную зону, пашкоджвае 7 кв. м газону, а кошт узнаўлення такога ўчастка складае каля $55. Летась ва ўкраінскай сталіцы было зафіксавана больш за 7 тыс. падобных парушэнняў. Таблічкі з надпісам «Свіння за рулём» будуць прымацаваныя ў месцах няправільнай паркоўкі, а кіроўцаў-парушальнікаў стануць штрафаваць.

◢ **Жанчына выкінулася з акна і забіла журналіста. 72-гадовы Герман Лінг у ноч на 22 сакавіка няспешна прагульваўся па адной з вуліц Брусэля, калі раптам здарылася неверагоднае. Зверху звалілася 67-гадовая Раймон Дэсмарэтс, якая вырашыла скончыць жыццё самагубствам. У выніку загінула не толькі яна, але і мужчына. Па словах сяброў і суседзяў Раймон, 5 гадоў таму памёр яе каханы муж, з той пары яна страціла цікавасць да жыцця і марыла хутчэй трапіць да сваёй другой палавінкі. Герман Лінг, які стаў яе выпадковай ахвярай, быў аматарам спорту і раней працаваў у газеце, пісаў пра баскетбол і тэніс. У яго засталося 5 дзяцей і некалькі ўнукаў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА 9 апреля 2010 г.

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка бел. руб.
1	1. Здание «Контрольно-пропускного пункта» (инв. № 47) – одноэтажное кирпичное здание площадью 69 кв.м. 2. Одноэтажное кирпичное здание бытовых помещений (инв. № 49), общая площадь 229 кв.м. 3. Здание «Контора автобазы» (инв. № 50) – одноэтажное кирпичное здание общей площадью 156 кв.м. 4. Сооружение «Площадки, дороги» (инв. № 54), общая площадь 871,5 кв.м. 5. Сооружение «Стоянка для автомобилей» (инв.№ 55), общая площадь 2073 кв.м.	74 234 480	3 711 000
2	Сооружение «Ограждение» (инв. № 42), общая длина 335 м.п.	15 323 900	766 000
3	Сооружение «Склад-навес», общая площадь 300,0 кв.м, год постройки 1968, строение капитальное, инв. № 38.	42 947 940	2 147 000
	Продавец имущества: управляющий ООО «Реми», адрес объектов: **г. Речица, ул. Пролетарская, 118;** шаг торгов – 10 %.		
4	Здание мебельного цеха и бытовых помещений общей площадью 1394,50 кв.м.	256 612 405	12 830 000
5	Здание котельной общей площадью 91 кв.м.	31 011 120	1 550 000
6	Изолированное нежилое помещение (цех присадки ЩМД) общей площадью 179,4 кв.м.	69 728 990	3 486 000
7	Изолированное нежилое помещение (склад готовой продукции) общей площадью 179,4 кв.м.	81 437 006	4 071 000
	Продавец имущества: управляющий БИ СП ЗАО «Реан», адрес объектов: **г. Речица, ул. Луначарского, 97;** шаг торгов – 8 %.		
Срок подачи заявления	**До 17.00 8 апреля 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а.		
Дата, время, место проведения аукциона	**9 апреля 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал НП РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация».		
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в Филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509.		
Условие продажи	Без условий. Цены указаны без НДС. Вознаграждение – 5 % от стоимости цены продажи лота.		
Условие пользования	Объекты продаются в собственность.		

Дополнительная информация по тел.: 8 (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

ДРАМА НА ФЕРМЕ

На ферме ў в. Валахва пад Баранавічамі ўзнікла сварка паміж двума работнікамі, якая закончылася трагедыяй. 33-гадовага бацьку пяцярых дзяцей ударыў нажом напарнік. Цяжкапаранены здолеў дайсці да свайго дома, дзе і памёр. Забойцу, які толькі чатыры месяцы як выйшаў з турмы, затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «ТЕХОБСЛУЖИВАНИЕ 17 КМ» ЗА 2009 ГОД

Количество акционеров 318. Из них юридических лиц 1, физических 317.

Начислено дивидендов в отчетном периоде — нет. Обеспеченность акции имуществом Общества — 58 000 руб. Просроченная дебиторская кредиторская задолженность — нет. Акции, находящиеся на балансе Общества, — 467 штук. Число работающих в Обществе — 5 человек.

Бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках (млн руб.)

Уставный фонд	183
Основной фонд	872
Выручка от реализации товаров, услуг	181
Налоги и сборы от реализации товаров, услуг	29
Себестоимость товаров, услуг	138
Прибыль	14
Прочие налоги, сборы из прибыли	14
Чистая прибыль	0

УНП 690652637

«ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ»
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ШВЕЙНАЯ ФАБРИКА «ДИНАТА»

222310, г. Молодечно, ул. Ясинского, 36,
тел. 8(0176) 76 07 47, тел./факс 74 67 88

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 г. млн руб.

Наименование показателя	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
АКТИВ			
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	364	1833
Нематериальные активы	120		
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	1303	57
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	**190**	**1668**	**1891**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	564	202
Налоги по приобретенным ценностям	220	13	2
Дебиторская задолженность	240	77	10
Расчеты с учредителями	250		
Денежные средства	260	340	74
Финансовые вложения	270	3	3
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**997**	**291**
БАЛАНС	**300**	**2665**	**2182**
ПАССИВ			
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ			
Уставный фонд	410	45	45
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	143	143
Добавочный фонд	430	1110	1153
Чистая прибыль (убыток) за отчетный период	440		
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	849	511
Целевое финансирование	460		
Доходы будущих периодов	470		
ИТОГО по разделу III	**490**	**2148**	**1853**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Прочие долгосрочные обязательства	520		
ИТОГО по разделу IV	**590**		
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	210	280
Кредиторская задолженность	620	307	49
Задолженность перед участниками (учредителями)	630		
Резервы предстоящих расходов	640		
Прочие краткосрочные обязательства	650		
ИТОГО по разделу V	**690**	**517**	**329**
БАЛАНС	**700**	**2665**	**2182**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	2885	9169
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	447	1554
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	2438	7615
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	2747	6780
Валовая прибыль	040	-309	835
Расходы на реализацию	060		
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	070	-309	835
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	27	16
Налоги, включаемые в операционные доходы	081	4	2
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	090	23	14
В том числе: проценты к получению	091		
Доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		
Доходы от операций с активами	093		
Прочие операционные доходы	099	23	14
Операционные расходы	100	21	13
В том числе: проценты к уплате	101		
Расходы операций с активами	102		
Прочие операционные расходы	109	21	13
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов	**120**	**2**	**1**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130		
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140		
Внереализационные расходы	150	14	46
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	**160**	**-14**	**-46**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (70-120-160)	**200**	**-321**	**790**
Налог на прибыль	250		199
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	10	25
Прочие расходы и платежи из прибыли	270		
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**-331**	**566**

Количество акционеров – 2. В том числе: физических лиц – 2.

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателя	Един. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Млн руб.	-	30
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Руб.	-	203
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тыс. руб.	12353	14320
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	Штук	-	-

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ

Просроченная дебиторская задолженность	Млн руб.	-	-
Просроченная кредиторская задолженность	Млн руб.	-	-
Среднесписочная численность работающих	Человек	131	142

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, работ, услуг: **швейное производство.**

Данные отчетности подтверждены аудиторским заключением ИП Т.Л. Рабушка, лицензия № 02200/0495526, продленная 03.02.2009 г. сроком до 21.03.2014 г.

Руководитель **В.М. Катинель**

Главный бухгалтер **Т.В. Торубарова**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

Аукционы по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по изготовлению документации, необходимой для проведения аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона
1	Земельный участок с кадастровым номером 221285913101000064 площадью 0,1638 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Тетерки, д. 38	Для строительства и обслуживания жилого дома	Коммуникации отсутствуют. Участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам, находится в водоохранной зоне вне прибрежной полосы р. Западная Двина	626 606	62 600 бел. руб. р/с 3600314090013 ф/л № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	535 948	2 035 210
2	Земельный участок с кадастровым номером 221285909101000041 площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Лущиха, ул. Набережная, д. 10Б	Для строительства и обслуживания жилого дома	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, располагается в водоохранной зоне вне прибрежной полосы р. Западная Двина. Охранная зона линии электропередач напряжением свыше 1000 В.	471 570	47 150 бел. руб. р/с 3600314090013 ф/л № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	509 140	2 035 210
Дата, время и место проведения аукциона – 30.04.2010 в 15.00, г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 19.04.2010 г. до 17.30.							
1	Земельный участок с кадастровым номером 221281201601000052 площадью 0,2499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, д. 5А (повторный аукцион)	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам	605 588	60 500 бел. руб. р/с 3600314020012 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, МФО 150801259, УНП 300972045, код платежа 4616, получатель платежа: Вороновский сельский исполнительный комитет	540 698	2 035 210
2	Земельный участок с кадастровым номером 221282904601000060, площадью 0,2112 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Зароново, ул. Светлая (повторный аукцион)	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Наличие централизованного водоснабжения. Ограничения: 1) водоохранная зона водного объекта вне прибрежной полосы (озеро Зароновское); 2) охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В.	474 451	47 000 бел. руб. р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет	924 100	2 035 210
Дата, время и место проведения аукциона – 14.04.2010 в 15.00, г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 06.04.2010 г. до 17.30.							

Аукционы на право заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка, срок аренды	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по изготовлению документации, необходимой для проведения аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона	Размер упущенной выгоды, руб.
1	Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003606 площадью 0,1112 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Оршанский район, Задровьевский с/с, западнее д. Задровье	Для строительства и обслуживания станции технического обслуживания. Срок аренды – 25 лет	Наличие электроснабжения, наличие асфальтированного подъезда, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне вне прибрежных полос р. Адров	14 589	1 450 бел. руб. на р/с Оршанского РАЙФО № 3602322000067 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300168540, код платежа 04002. Получатель платежа: РАЙФО Оршанского районного исполнительного комитета	580 761	3 670 490	30 270
Дата, время и место проведения аукциона – 28.04.2010 г. в 15.00, г.Орша, ул. Островского, 2 в здании Оршанского районного исполнительного комитета. Окончательный срок приема документов – 22.04.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга»								
1	Земельный участок с кадастровым номером 221288503601000079 площадью 0,010 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Тулово	Земельный участок под размещение объекта «Остановочный павильон с торговым павильоном в д. Тулово». Срок аренды – 5 лет	Наличие централизованного водоснабжения, водоотведения, газоснабжения. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам	30 317	3 030 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета	49 007	3 670 490	–
Дата, время и место проведения аукциона – 29.04.2010 г. в 15.00, г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 23.04.2010 г. до 17.30								

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка оплатить предмет аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона.

В случае приобретения зем. участка в частную собственность – осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него. В случае приобретения права аренды не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнений условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

1. **Для участия в аукционе приглашаются:** при продаже земельного участка в частную собственность – граждане и юридические лица Республики Беларусь, при продаже права на заключение договора аренды земельного участка – граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz , www.gki.gov.by.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
6 апреля 2010 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот |
|---

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 сакавіка 2010 г. № 12 (206)

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ВЯЛІКАЯ КРЫЎДА ПЕРАСЯЛЕНЦА

Калі хто не памятае, нагадаю: пасля катастрофы 1986 года ў межах тагачаснага чорнага фальклора беларусаў называлі «чарнобыльскімі вожыкамі». І адпаведна ставіліся — з жахам і непаразуменнем. Прычым жыхары Хойніцкага, Веткаўскага, Нараўлянскага, Брагінскага ці Хойніцкага раёнаў гэты жах адчувалі, калі перасяляліся ў самыя бліжэйшыя, але так званыя «чыстыя» раёны: Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Светлагорскі... А гамяльчане — калі выязджалі на аздараўленне ў Мінскую ці Віцебскую вобласці. Расказвалі, што нашы людзі сутыкаліся з адмоўным і насцярожаным стаўленнем і ў Італіі, Канадзе, Германіі... І гэта датычылася літаральна ўсіх беларусаў, якія траплялі на далёкія замежныя землі.

Чаго гісторыю варушыць? — спытаеце вы. Сутнасць у тым, што з аналагічным стаўленнем сутыкнуўся, па яго ўспамінах, былы жыхар Хойнікаў Георгій Сцяпанавіч Хліманкоў, калі ў пачатку 90-х перасяліўся з сям'ёй у вёску Пціч Петрыкаўскага раёна. Колькі вады ўплыло з таго часу ў самай прыгожай у Беларусі (на мой погляд) невялічкай рачулцы з такой жа пяшчотнай назвай Пціч? Не пералічыць. І людзі даўно прывыклі адно да аднаго, мясцовыя перамяшаліся з прыезджымі, створаныя тады сем'і хутка адзначаць сярэбранае вяселле, і дзяцей ужо гадуюць сёння тыя, каму наканавана было нарадзіцца ў той жудасны час. Але ж дагэтуль захоўвае сваю крыўду Георгій Сцяпанавіч: не спраўдзіліся яго колішнія надзеі. Кажа, абяцалі ім тады багата, а вось не атрымалі яны, перасяленцы, нічога. Дыялог у нас адбыўся такі (захоўваю стылістыку рэспандэнта):

— Калі сюды запрашалі перасяленцаў — усё абяцалі, бо мы б сюды маглі не паехаць. А ў канчатковым выніку выцерлі ногі аб гэтых перасяленцаў і ўсё. Абяцалі ацяпленне цэнтральнае. Траншэі вырылі, паклалі бетонныя жолабы для труб уздоўж вуліц. Потым закончыліся сродкі, і ўсё засыпалі. Агарод узараць — няможна было дабіцца толку. Была лазня, добры будынак, а цяпер няма нічога. Старшыня сельскага Савета палец аб палец не ўдарыў! Вы напішыце тое, што я кажу, а я кажу справядліва! Кіраўнікі, якія былі, пасады паатрымлівалі добрыя, потым паехалі, і ім навошта гэтыя перасяленцы.

— Вы хочаце прыцягнуць да адказнасці тых людзей?

— Не, я нічога не хачу. Я хачу, каб вы напісалі і каб памяталі, што рабілі і што трэба рабіць. Мне яно сто гадоў не трэба. Мне засталося, можа, нямнога.

— А што ж сёння трэба рабіць?

— Паступаць з людзьмі па-людску. Я хачу, каб тыя людзі, якія ўжо не працуюць, адчулі, што яны рабілі не тое, што трэба. Я маю стасункі з перасяленцамі, якія жывуць у Мінскай вобласці, кажуць — усё вельмі добра, стаўленне ўважлівае. Прыходзілі да іх з Савета і райвыканкама. Няхай нічым і не дапамаглі, але ж спыталі — як вы жывяце. А тут ніхто нічога. Вось такое маё меркаванне.

Між тым, у 90-я гады Георгій Сцяпанавіч са сваякамі, як і іншыя сем'і, якія абралі Пціч для пастаяннага месца жыхарства, атрымаў асабісты дом агульнай плошчай 75 квадратных метраў — замест таго, што прыйшлося кінуць у Хойніках. Ва ўсе дамы адразу былі падведзены водаправод і каналізацыя. Як расказаў старшыня Пціцкага сельскага Савета Уладзімір Паграноўскі, будаўніцтвам дамоў для перасяленцаў у 90-я гады кіраваў зяць Георгія Хліманкова — начальнік ПМК-4 Юрый Перавознікаў:

— Яго дачка з зяцем і цяпер побач жывуць — у Капаткевічах. Астатнія дзеці — хто ў Мінску, хто ў Мазыры. А яны з жонкай тут засталіся, у Пцічы. У доме Георгія Хліманкова, як і ў іншых перасяленцаў, усталяваны кацёл для цвёрдых відаў паліва — дроў, брыкету...

Прынамсі, многія з тых, хто ў іншых вёсках правёў жаданае «блакітнае паліва» ў асабістыя дамы, добра адчуваюць і такую праблему — аказалася, нятаннае гэта задавальненне — прыродны газ! І таму часта вяртаюцца, калі магчыма, да традыцыйных, мясцовых відаў паліва.

Што ж датычыцца цэнтралізаванага ацяплення аграгарадка Пціч, наўрад ці будзе яно праведзена ў найбліжэйшы час. Хоць газаправод праходзіць зусім побач і няма тэхнічных складанасцяў «кіпуць» яго сюды. Але ж ёсць іншыя «але». Пра іх мне расказала Надзея Гіленка, намеснік старшыні Петрыкаўскага райвыканкама.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДВА «КІТЫ» МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

Кадры і бюджэт вырашаюць усё

У свой час Указ № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў рашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» вызначыў шаснаццаць крыніц папаўнення пярвічных бюджэтаў (пачынаючы ад падаткаў на нерухомасць і зямлю і заканчваючы зборам з нарыхтоўшчыкаў сельскагаспадарчай прадукцыі). Аднак, насуперак чаканням прадстаўнікоў пярвічнага ўзроўню ўлады, у названы пералік не ўвайшоў падаходны падатак з фізічных асобаў, якія працуюць на тэрыторыі сельсавета. Ён, падатак, цалкам адпраўляўся на раённы ўзровень. А пярвічнаму бюджэту «зверху» выдзяляліся датацыі — для рэгулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця мясцовасці.

Такое становішча рэчаў, магчыма, не зусім задаволіла рэгіёны. Але ўказ ёсць указ, і яны вымушаныя былі з гэтым пагадзіцца. За выключэннем Віцебскай вобласці, якая пайшла на своеасаблівы «эксперымент» — зрабіла падаходны падатак з фізічных асобаў адной з асноўных крыніц папаўнення сельсавецкіх бюджэтаў. Вось ужо тры гады гэты падатак (дакладней, працэнтныя адлічэнні ад яго) застаецца на пярвічным узроўні і з'яўляецца рэгулюючай фінансавай крыніцай на тэрыторыі.

Пра тое, як гэта «дзейнічае» на практыцы, а таксама пра некаторыя іншыя вынікі рэалізацыі Указа № 21 расказала старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў Ірына НОВІКАВА.

— Цяпер, калі прайшло тры гады пасля падпісання Указа № 21, стала зразумелым, наколькі ён быў патрэбным і своечасовым. Нельга сказаць, што да 2007 года мы нічога не рабілі, не вырашалі пытанні. І рабілі, і вырашалі — проста ўзровень быў іншым. Пасля таго як Прэзідэнт зацікавіўся фарміраванням «вертыкалі» зверху данізу, да пярвічнага звяна ўключна, занепакоіўся ўмовамі працы гэтага звяна, і з'явіўся адпаведны заканадаўчы акт у выглядзе Указа № 21. Дзякуючы гэтаму дакументу значнасць органаў улады пярвічнага ўзроўню відавочна ўзрасла. А ўплывовасць і роля кожнага органа ўлады трымаецца на двух «кітах» — фінансах і кадрах.

— Давайце пачнём з кадраў...

— Указ зацвердзіў палажэнне аб старшыні сельскага выканаўчага камітэта. Магу сказаць, што кадравы склад старшыняў сельскіх Саветаў цяперашняга 25 склікання ў нас у раёне быў сфарміраваны ўжо з улікам патрабаванняў указа і на падставе палажэння. Сёння на ўзроўні старшыні райвыканкама з удзелам усіх яго намеснікаў і членаў выканкама абавязкова праводзіцца (у форме гутаркі) ўзгадненне кандыдатуры на пасаду старшыні сельскага Савета. Кандыдатуру для ўзгаднення прадстаўляе старшыня раённага Савета дэпутатаў. Гэта вельмі адказны момант, і кандыдат у кіраўнікі пярвічнага ўзроўню ўлады сур'ёзна да яго рыхтуецца. Падчас гутаркі кожны з прысутных можа задаваць яму самыя розныя пытанні, якія датычацца жыццядзейнасці тэрыторыі. Скажу, што кандыдатуры на пасаду старшыні і сакратара таго ці іншага сельвыканкама ўключаныя ў кадравы рэестр старшыні райвыканкама. Свой кадравы рэестр створаны і ў кожным сельвыканкаме.

На працягу трох гадоў мы адпрацоўвалі і сістэму ўзгаднення са старшынёй сельскага Савета кандыдатур кіраўнікоў арганізацый і структурных падраздзяленняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. Прычым, у мэтах умацавання аўтарытэту і ўплывовасці пярвічнага звяна ўлады, са старшынёй сельскага Савета ўзгадняецца яшчэ і прэміраванне кіраўнікоў бюджэтнай сферы. Напрыклад, пытанне аб прэміраванні (ці аб пазбаўленні прэміі) дырэктара школы вырашае начальнік раённага аддзела адукацыі — але толькі пасля ўзгаднення са старшынёй сельвыканкама.

— А кандыдатуру самога дырэктара школы перад прызначэннем узгадняюць з кіраўніком пярвічнага ўзроўню ўлады?

— Безумоўна. Як і ўсіх іншых кіраўнікоў установ, што знаходзяцца на падведамаснай тэрыторыі. І мяне вельмі радуе сам факт, калі, напрыклад, дырэктар раённай ЖКГ накіроўвае старшыні сельскага Савета ліст з просьбай узгадніць тую ці іншую кандыдатуру ў якасці начальніка ўчастка жыллёва-камунальнай гаспадаркі — таму што ўчастак знаходзіцца на тэрыторыі сельсавета. Усё гэта, безумоўна, працуе на аўтарытэт мясцовай улады.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Гэтаксама, як і наяўнасць фінансавай базы, дастатковай для вырашэння мясцовых пытанняў, развіцця тэрыторыі... Што змянілася пасля таго, як у Шумілінскім раёне пачалі пакідаць у бюджэтах пярвічнага ўзроўню «працэнт» ад падаходнага падатку з фізічных асобаў?

— Пасля прыняцця ўказа мы разглядалі і пралічвалі шмат варыянтаў фарміравання пярвічных бюджэтаў. І нарэшце прыйшлі да высновы: неабходна імкнуцца да павелічэння долі ўласных даходаў і скарачэння ўзроўню датацый... Калі, напрыклад, да рэалізацыі ўказа даходная частка бюджэтаў пярвічнага ўзроўню складала ў нас усяго 10 працэнтаў, то цяпер гэта 70 працэнтаў і больш. Адчуваеце розніцу?

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ІНТРЫГА... ПРАДБАЧЫЦЦА

Ужо зусім хутка мы даведаемся, хто ж стаў прэтэндэнтам на дэпутацкі мандат. Сёння апошні дзень рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. А значыць, распачынаецца самы цікавы этап кампаніі — агітацыя.

Кожнага кандыдата ў дэпутаты, пачынаючы ад раённага звяна, мы, выбаршчыкі, зможам паслухаць па радыё. Праўда, як паказвае практыка, далёка не ўсе ўдзельнікі мясцовых выбараў такой магчымасцю карыстаюцца. Аднак патэнцыйна пяцівілінное выступленне па мясцовым дзяржаўным радыё — за імі. Акрамя таго, кандыдат атрымае невялікую грашовую падтрымку на выраб перадвыбарных лістовак і плакатаў.

— Сёлета кандыдаты ў дэпутаты могуць аб'ядноўваць свае сродкі і выпускаць сумесныя плакаты і лістоўкі, чаго не было раней, — нагадала пра змены выбарчага заканадаўства падчас сустрэчы з журналістамі **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня ЦВК**. — Што да публікацый у газетах, то законам такіх гарантый не прадугледжана, аднак, калі газеты захочуць прадстаўляць кандыдатаў, яны маюць права гэта рабіць бясплатна. Адзінае, яны павінны захоўваць роўнасць: калі напісалі пра аднаго кандыдата, то, натуральна, яны абавязаныя рабіць гэта па ўсіх асобах у гэтай акрузе.

Для розных акруг прынцып роўнасці не патрабуецца, бо папросту кандыдаты не з'яўляюцца адзін аднаму канкурэнтамі.

Пакуль у Цэнтрвыбаркаме не падагулілі звесткі па рэгістрацыі, зірнём на склад вылучэнцаў. 6,3 працэнта — маладыя людзі (да 31 года), 44,6 — жанчыны (у выбараў па традыцыі жаночы твар — і ў плане арганізатараў, і ў плане ўдзельнікаў, дакладней, удзельніц). 29 грамадзян Расіі, якія пастаянна пражываюць на нашай тэрыторыі, пажадалі ўдзельнічаць у выбарах. Што да роду дзейнасці, то большасць нашых патэнцыйных прадстаўнікоў ва ўладзе працуюць у сферы адукацыі, культуры, навукі, аховы здароўя (яно і нядзіўна, настаўнікі і ўрачы — тыя, каго ведаюць мясцовыя жыхары). Сярод патэнцыйных кандыдатаў ёсць і нашы калегі — супрацоўнікі мас-медыя. Дарэчы, журналістам, якія ўдзельнічаюць у выбарах, забаронена іх асвятляць (з моманту рэгістрацыі іх у якасці кандыдатаў). Дастаткова шмат па Мінску вылучана студэнтаў. А гэта сведчыць пра палітычную актыўнасць нашай моладзі. Сярод вядомых персаналій, вылучаных ад сталіцы — кіраўнік Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, а таксама вядомы гумарыст Яўген Крыжаноўскі. Цікавыя баталіі чакаюцца па адной з мінскіх акругаў (у выпадку рэгістрацыі прэтэндэнтаў), дзе вылучыліся кіраўнік будаўнічага прадпрыемства МАПІД і старшыня таварыства падманутых забудоўшчыкаў... Карацей, інтрыга прадбачыцца, застаецца толькі крыху пачакаць...

Зоя ВАРАНЦОВА.

ВЫБАРЫ-2010

Кампанія набірае абароты

З надыходам вясны пачала набіраць абароты перадвыбарчая кампанія ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Як яна праходзіць у сталічным рэгіёне, «МС» расказаў старшыня Мінскай абласной выбарчай камісіі Аляксей ВАСІЛЬЕЎ.

— Перадвыбарчая кампанія праходзіць спакойна, згодна з планам, без якіх-небудзь узрушэнняў. Пісьмовых скаргаў на працу камісій (і тэрытарыяльных, якіх у нас 60, і акружных — іх 305) да нас не паступала. Нам тэлефанавалі людзі, якім камісіі адмовілі ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп, але падчас размовы кожны раз высвятлялася, што ўсе адмовы былі абгрунтаванымі. У судах дзеянне камісій не абскарджвалася, што, на мой погляд, сведчыць аб выдатнай арганізацыі работы ў гэтым плане.

— На якім этапе сёння знаходзіцца перадвыбарчая кампанія?

— Усе перадвыбарчыя мерапрыемствы можна ўмоўна падзяліць на тры этапы. Першы этап — арганізацыйны, калі праходзяць пасяджэнні палітычных партый і сходы працоўных калектываў, на якіх вызначаюць кандыдатаў на вылучэнне, збіраюцца подпісы грамадзян у падпісныя лісты. Другі этап — агітацыйны ці публічны — настае, калі ўжо зарэгістраваныя кандыдаты выступаюць у сродках масавай інфармацыі, размяшчаюць агітацыйныя плакаты ў месцах масавага наведвання грамадзян, каб данесці да выбаршчыкаў сваю праграму, з якой яны ідуць у мясцовыя Саветы. Трэці, заключны этап — непасрэдна выбары, калі ад кандыдатаў ужо нічога не залежыць.

На сёння першы этап амаль завяршыўся. Па 25 сакавіка ўключна камісіі вывучаюць пададзеныя дакументы і потым прымуць рашэнне — зарэгістраваць прэтэндэнтаў у якасці кандыдатаў у дэпутаты ці адмовіць у рэгістрацыі. Тыя, каго зарэгіструюць, будуць мець права перайсці да другога этапу — працаваць са СМІ.

— Па якіх прычынах прэтэндэнт можа атрымаць адмову ў рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты?

— Тут трэба размежаваць: ёсць безумоўнае адмаўленне (калі кандыдат не набраў неабходнай колькасці подпісаў, мае судзімасць, у падпісных лістах быў выяўлены пэўны працэнт несапраўдных подпісаў) і ёсць норма, якая дае камісіі права адмовіць у рэгістрацыі. Напрыклад, калі кандыдат дапусціў недакладнасць пры запаўненні падатковай дэкларацыі (не ўказаў пэўную сваю маёмасць, скажам, некалькі аўтамабіляў і будынкаў). У такім выпадку камісія мае права адмовіць у рэгістрацыі. Тое ж тычыцца і выпадкаў, калі было выяўлена выкарыстанне пераваг службовай асобы ў сваіх інтарэсах, удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў, прымушэнне ў працэсе збору подпісаў і ўзнагароджанне выбаршчыкаў за ўнясенне подпісаў. Прэтэндэнт, якому адмовілі ў рэгістрацыі, можа падаць скаргу ў вышэйстаячую камісію. У нашым выпадку — у Мінскую абласную выбарчую камісію. Пакуль што фактаў адмаўлення ў рэгістрацыі кандыдатаў не было, але гэта цалкам натуральная з'ява падчас такіх палітычных мерапрыемстваў. Наша камісія да прыёму скаргаў гатовая.

— Раскажыце, дзе найбольш актыўна ідзе вылучэнне кандыдатаў?

— Найбольшая актыўнасць назіраецца ў буйных прамысловых рэгіёнах, такіх як Салігорск, Барысаў. Можна меркаваць, што і канкурэнтная барацьба тут будзе больш жорсткай. Найчасцей вылучэнне кандыдатаў адбываецца шляхам збору подпісаў. Такім спосабам вылучаны 2531 чалавек, ці 56,3 працэнта, у той час як, напрыклад, працоўнымі калектывамі — толькі 1962, ці 11,4 працэнта.

Для збору подпісаў прэтэндэнту дастаткова было сфарміраваць ініцыятыўную групу ад 3 да 10 чалавек (гэта могуць быць калегі, суседзі і г. д.) і зарэгістраваць яе, што зусім нескладана. Гэта самы просты спосаб, а таму і самы папулярны.

— Ці ёсць рызыка сутыкнуцца з недахопам кандыдатаў у сельскія, пасялковыя Саветы дэпутатаў?

— У нас няма такой занепакоенасці. Як паказвае практыка, на тэрыторыі кожнага сельсавета пражываюць людзі, якія зацікаўлены ў развіцці свайго рэгіёна. А паўплываць на сітуацыю яны могуць у тым ліку і праз удзел у рабоце мясцовых органаў улады.

— Аднак у сельскай мясцовасці асноўны працэнт жыхароў — пенсіянеры, якія з-за ўзросту менш сацыяльна і палітычна актыўныя. Не кожны пенсіянер захоча пайсці ў дэпутаты...

— Так. Але, як правіла, на тэрыторыі многіх сельсаветаў ёсць аграгарадкі, дзе шмат грамадзян працаздольнага ўзросту. Не трэба забывацца і пра маладых спецыялістаў.

— Значыць, сітуацыі, калі ад адной выбарчай акругі вылучаўся б адзін кандыдат, не надарыцца?

— Я не выключаю такую магчымасць, але зараз гаварыць пра гэта рана. Паўтаруся, да 25 сакавіка камісіі занятыя разглядам дакументаў. Можа атрымацца так, што дзесьці з трох прэтэндэнтаў на рэгістрацыю ў якасці кандыдатаў камісія двум адмовіць (не набярэцца дастатковай колькасці подпісаў, выявіцца судзімасць прэтэндэнта і г. д.). Тады па факце застанецца адзін кандыдат. Вынікі можна будзе падвесці пасля 25 сакавіка.

— Як паўплывалі змены ў выбарчым заканадаўстве на правядзенне гэтай перадвыбарчай кампаніі? Ці мае яна нейкія асаблівасці?

— Новае выбарчае заканадаўства больш простае, зразумелае. Спрашчэнне працэдуры рэгістрацыі ініцыятыўных груп прывяло да актывізацыі вылучэння кандыдатаў шляхам збору подпісаў, пра што сведчыць і статыстыка, якую мы прыводзілі вышэй. Што тычыцца асаблівасці, адзначу, што ў параўнанні з аналагічнай кампаніяй чатырохгадовай даўнасці значна выраслa грамадзянская свядомасць і выбаршчыкаў, і саміх кандыдатаў. Людзі ў сельскай мясцовасці з усімі сваімі праблемамі ідуць у сельскі Савет, старшыня якога адначасова з'яўляецца і старшынёй сельвыканкама. Грамадзяне бачаць, што ўжо на гэтым узроўні робяцца канкрэтныя захады па вырашэнні іх праблем. І абласным, і раённымі Саветамі прымаюцца рашэнні аб развіцці пэўнага рэгіёна, зацвярджаюцца мясцовыя бюджэты і праграмы. Роля Саветаў усіх узроўняў узрастае, статус дэпутата павышаецца. Адпаведна большую актыўнасць праяўляюць і выбаршчыкі, і кандыдаты. У людзей ёсць сур'ёзная зацікаўленасць у выніках выбараў.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

САБРАЦЦА З СІЛАМІ.

У тым ліку і з мясцовымі

Парламентарый Галіна ЮРГЯЛЕВІЧ — прыхільніца сістэмнага падыходу да праблем раёна

Чым вышэй мы ўздымаемся ў сваёй іерархіі патрэбаў, тым болей нам хочацца, тым смялейшыя нашы памкненні. Але пакуль у нас не будзе базісу, і гаворкі не можа ісці пра лёсы свету. Цяжка клапаціцца пра тое, што адбываецца там, наверсе, калі ў нас дах працякае... А значыць, запэцканы ліфт у новабудоўлі, хамаватыя падлеткі на лаўцы ля пад'езда і смецце, не вывезенае з перапоўненага машынамі двара, — не такія ўжо і дробязі. Іх нельга недаацэньваць. Як нельга недаацэньваць у вырашэнні гэтых праблем усе сілы — «вертыкаль», дэпутатаў мясцовых Саветаў, парламента і... саміх людзей. Ніводнае з гэтых звёнаў не павінна быць слабым, усім ім варта знаходзіцца ў звязцы.

Здабыткамі Заводскага раёна сталіцы дзеліцца Галіна Юргялевіч, намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе.

— Чым могуць быць карысныя самаарганізацыі насельніцтва і які вопыт вашай акругі — Шабаноўскай?

— Такія ўтварэнні ў стане вырашаць многае — яны бліжэй за ўсё да людзей і як ніхто ведаюць праблемы. І размова не толькі пра пытанні камунальнага характару, добраўпарадкавання, належнага ўтрымання жылля, забеспячэння чысціні навакольнага асяроддзя. Гэта датычыцца і стасункаў паміж жыхарамі — падтрыманне грамадскага парадку, правядзенне нейкіх культурна-забаўляльных акцый, выхаваўчых мерапрыемстваў і гэтак далей. Аднак для гэтага, я глыбока перакананая, трэба павярнуць псіхалогію людзей, асабліва сталага ўзросту. Як бы балюча гэта ні было...

Пераважна ўсе кватэры цяпер прыватызаваныя, а ў прыватную ўласнасць уваходзіць і агульная маёмасць: і лесвічная пляцоўка, і пад'езд. Але псіхалогія нашых людзей па звычцы застаецца ранейшай: нехта ім павінен зрабіць. І калі да мяне як да дэпутата прыходзяць на прыём (а такія сустрэчы я праводжу тры разы на месяц) і скардзяцца: «У нас на лесвічнай пляцоўцы моладзь курыць», я заўжды кажу — гэта ж ваш дом, ваш пад'езд, вы ж ведаеце бацькоў тых падлеткаў...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 9 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрачайнікі, DVD-прайгравальнікі, тэлевізары, печ ЗВЧ і кухонны камбайн. Розыгрыш прызоў адбудзецца **13 красавіка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 красавіка 2010 г.**

Дастаўку прызоў ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 30 чэрвеня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 02.03.10.

Тэрмін правядзення гульні — з 2.03.10 па 30.06.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1639 ад 26.02.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

9 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 1-е паўг. 2010 года**

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____
(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ВЯЛІКАЯ КРЫЎДА ПЕРАСЯЛЕНЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Мы выязджалі ў гэты населены пункт з інфармацыйна-прапагандысцкай групай. Нам задавалі пытанні і пра газіфікацыю: якія сродкі трэба ўкласці прыватніку, як яна будзе ажыццяўляцца, што ўкладзе дзяржава? Калі большая частка жыхароў населенага пункта Пціч на агульным сходзе выкажацца «за» газіфікацыю, яны павінны звярнуцца ў райвыканкам, і мы далей будзем рухаць гэтае пытанне. Калі бюджэт выдзеліць грошы, газ будзе падведзены непасрэдна да населенага пункта. Потым трэба ствараць газавы кааператыў. Дзяржава на газаправод грошы выдзеліць, што ж датычыцца асабістых, да кожнага дома, дык спатрэбіцца з кожнага двара сабраць па 6 мільёнаў рублёў — гэта не танны праект. Магчыма, людзям трэба будзе браць крэдыт. Менавіта таму, хутчэй за ўсё, толькі адзінкі з жыхароў будуць «за» падвядзенне газу. А вось бясплатна не атрымаецца. На гэты год у нас вёска Мышанка ўключана ў план газіфікацыі. Няхай і ў Пцічы ініцыююць. Калі будзе ініцыятыва насельніцтва, выканкам пачне прапрацоўваць гэтае пытанне. Магчыма, тады ўключым праект у бюджэт на наступны год.

Тое ж самае пацвердзіў і галоўны спецыяліст упраўлення па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Гомельскага аблвыканкама Сяргей Урублеўскі.

— Бясплатна газаправод сёння праводзіцца толькі там, дзе і цяпер няма чыстага паліва — у вёсках, якія да гэтага часу знаходзяцца пад уплывам «чарнобыльскага фактару». Петрыкаўскі раён чысты. Каб там у вёсках правесці газ, трэба ствараць адпаведныя кааператывы і плаціць свае грошы.

Што датычыцца лазні, пра якую так марыць Георгій Хліманкоў, яна будзе працаваць зусім хутка, — запэўнівае старшыня Пціцкага сельскага Савета Уладзімір Паграноўскі. Так што, калі Георгію Сцяпанавічу не падабаецца мыцца ў асабістай ванне — калі ласка, бліжэй да лета ў грамадскую лазню.

Праўда, абяцанням гэтым колішні перасяленец не верыць. Кажа:

— Ну можа і будзе тое — праз год або два...

І яшчэ адна бяда турбуе спадара Хліманкова: кажа, няма дзе кашулю звычайную ў Пцічы купіць. Для таго, каб у Георгія Сцяпанавіча з'явілася такая магчымасць, я зноў патурбавала Петрыкаўскі райвыканкам. Як расказала вядучы спецыяліст аддзела эканомікі Галіна Шчарбак, таварныя запасы ў мясцовай краме амаль у два разы перавышаюць нарматыўныя.

— Сёння ў вёсцы тавары прамысловай групы карыстаюцца абмежаваным попытам. Таму яны завозяцца толькі па папярэдніх заказах насельніцтва. У кожнай такой краме ёсць кніга папярэдніх заказаў. Калі заяўка паступае, на працягу 50 дзён прадукцыя завозіцца. А пасля звароту грамадзяніна Хліманкова ў гэтую ж краму завезена тавараў яшчэ на 11,5 мільёна рублёў — значна папоўнены асартымент, у тым ліку і адзення.

Зноў звяртаюся да Георгія Сцяпанавіча: ну як, адчулі перамены ў мясцовым гандлі?

— Прыязджаў да нас намеснік старшыні, а што змянілася? Нічога, здаецца, не змянілася, — адказвае. Ну можа быць, яны прывезлі які нехадавы тавар. У іх таваразвароту, напэўна, няма. Я ж у краме пасля таго і не быў. Што ж, я буду туды кожны дзень хадзіць? Сто гадоў яно мне трэба.

* * *

Так адбылося, што паралельна з высвятленнем праблем, якія турбуюць жыхара аграгарадка Пціч, да мяне ў гомельскі карпункт газеты «Звязда» патэлефанаваў жыхар іншай вёскі Петрыкаўскага раёна — Сякерычы. У яго былі пытанні наконт парушэнняў распарадку працы мясцовай Сякерыцкай крамы, асартыменту і разлікаў з кліентамі. Таму мне давялося адначасова займацца вырашэннем і гэтых гандлёвых праблем на Петрыкаўшчыне. Спачатку справаздачу трымала вядучы спецыяліст аддзела эканомікі Петрыкаўскага райвыканкама Галіна Шчарбак:

— У Сякерычы выязджалі дырэктар прадпрыемства «Капаткевіцкі каапгандль» Галіна Стасюк і старшыня Колкаўскага сельскага Савета Васіль Мазай. Яны правялі сустрэчу з жыхарамі вёскі, растлумачылі загадчыцы крамы парадак выканання рэжыму працы. Праверылі і асартыментны пералік, і магчымыя парушэнні дысцыпліны цэнаў. Будзем і надалей ажыццяўляць кантроль за гэтай крамай.

Зноў жа афіцыйную інфармацыю правяраю непасрэдна ў пакупнікоў крамы. Адказ ад грамадзяніна, які тэлефанаваў мне раней са скаргай, быў такі:

— Дзякуй вялікі, пасля вашага ўмяшання навялі парадак, усе цяпер працуюць так, як трэба, зусім іншая рэч!

Дык можа і жыхару аграгарадка Пціч Георгію Сцяпанавічу Хліманкову ўсё ж змогуць па гусце, памеры і цане падабраць кашулю ў мясцовай краме? Калі ён туды хоць бы сходзіць?

Пакуль жа, па яго словах, вырашаць праблемы з кашуляй, лазняй, цэнтралізаваным ацяпленнем і стаўленнем да перасяленцаў ён збіраецца ў Гомелі — пры сустрэчы з высокапастаўленымі адказнымі асобамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДВА «КІТЫ» МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Змяненне структуры сельсаветскіх бюджэтаў накіраванае ў першую чаргу на фарміраванне зацікаўленасці сельскіх Саветаў дэпутатаў, сельвыканкамаў у развіцці сваіх тэрыторый. Цяпер у «актыве» старшыні сельскага Савета 19 даходных крыніц, якія неабходна папаўняць, каб мець свой бюджэт. І не трэба ўвесь час залежаць ад датацый «зверху» і чакаць, калі табе іх дадуць (хоць датацыі, безумоўна, існуюць). Сёння найбольшую ўдзельную вагу ў структуры пярвічных бюджэтаў — 54 працэнты — займае падаходны падатак з фізічных асобаў. Ён у нас выступае рэгулюючай даходнай крыніцай. Базай для налічэння з'яўляюцца ўстановы адукацыі, аховы здароўя, культуры, сельгаспрадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі сельсаветаў. Мы ўзялі разнапланавыя аб'екты, якія выплачваюць людзям зарплату як у пачатку месяца, так і ў канцы — каб падаходныя падаткі ішлі ў мясцовы бюджэт пастаянна, каб увесь час папаўнялася яго даходная база. Працэнт адлічэнняў падаходных падаткаў зацвярджаецца рашэннем раённага Савета дэпутатаў на кожны чарговы год для кожнага сельсавета.

— Напэўна, старшыні сельскіх Саветаў не адразу зразумелі перавагі новай структуры бюджэтаў?

— Спачатку мы сапраўды падштурхоўвалі іх да гэтага, тлумачылі, чаму лепш зменшыць працэнт датацый і павялічыць удзельную вагу сваіх даходных крыніц... Сапраўднае разуменне прыйшло пад канец года — калі ўсе дадаткова зароблены сродкі засталіся ў распараджэнні сельскіх камітэтаў. Увогуле, павелічэнне даходнай часткі пярвічных бюджэтаў дало магчымасць фінансаваць вызначаныя ўказам артыкулы па-іншаму. І хоць мы фінансуем усе тыя кірункі, што, напэўна, фінансуюцца і ў астатніх рэгіёнах краіны, сельвыканкамы ў новых бюджэтных умовах могуць дзейнічаць больш смела.

> **«Нам не трэба ўвесь час залежаць ад датацый «зверху» і чакаць, калі іх дадуць».**

Дзякуючы ўмацаванню бюджэтаў пярвічнага ўзроўню шмат зроблена для развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх Саветаў. Толькі за тры апошнія гады на рамонт адміністрацыйных будынкаў сельвыканкамаў і іншыя матэрыяльна-тэхнічныя патрэбы было затрачана амаль 580 мільёнаў рублёў. У выніку сёння ўсе сельскія Саветы маюць аўтамабілі, паўсюдна ўсталяваныя камп'ютары са спецыялізаванымі праграмамі і працуе электронная пошта. Гэта не проста новыя ўмовы для арганізацыі працы пярвічнага ўладнага звяна, а адна са складовых яе аўтарытэту.

— Але некаторыя вашы калегі лічаць: навошта напружвацца і думаць, як павялічыць даходную частку пярвічных бюджэтаў, калі ёсць датацыі?

— Зразумела, калі датацыі ідуць без праблем, дык можна нічога не рабіць. Так лягчэй за ўсё. Але мы з дапамогай падаходных падаткаў вырашаем два пытанні. Па-першае, у даходную частку сельсавецкага бюджэту ідуць рэгулярныя паступленні, у выніку бюджэт пастаянна «працуе» на мясцовыя патрэбы. Па-другое, з'яўляецца зацікаўленасць старшыні сельскага Савета ў развіцці сваёй тэрыторыі. Калі ж забраць з бюджэту пярвічнага ўзроўню той жа падаходны падатак і замяніць яго на датацыю «зверху», то кіраўніку мясцовай улады будзе ўсё роўна, які памер заработнай платы на прадпрыемствах сельсавета, ці ствараюцца на тэрыторыі новыя прадпрыемствы і новыя працоўныя месцы... А нашы старшыні сельскіх Саветаў, наадварот, у гэтым зацікаўленыя. Больш працоўных месцаў — большы падаходны падатак, больш адлічэнняў у сельсавецкі бюджэт.

— Якія крыніцы папаўняюць бюджэты пярвічнага ўзроўню, акрамя падаходнага падатку?

— Падаткі на незавершанае будаўніцтва, на зямлю, на нерухомасць, збор з нарыхтоўшчыкаў сельгаспрадукцыі, рэгістрацыйны збор (ад аграэкасядзібаў), дзяржпошліна, арэнда зямлі, арэнда маёмасці... Сюды ж адносіцца і збор за валоданне сабакамі, а таксама штрафы. Дарэчы, рашэнне пра тое, каб пакідаць штрафы на той тэрыторыі, дзе яны былі выпісаныя, прынятае ў раёне яшчэ да выхаду Указа № 21.

Дастаткова актыўна працавала і такая дадатковая крыніца, як пазабюджэтныя фонды. За 2008—2009 гады туды паступіла больш за 40 мільёнаў рублёў добраахвотных узносаў грамадзян. Яны былі выдаткаваныя на тыя ці іншыя мясцовыя патрэбы — у адпаведнасці з рашэннямі сходаў грамадзян.

— Як вы думаеце, Ірына Мікалаеўна, чаму іншыя вобласці не пайшлі па шляху Віцебшчыны і не зрабілі падаходны падатак рэгулюючым для пярвічных бюджэтаў?

— Магчыма, яны жывуць багацей за нас і ніколі не ведалі вострага дэфіцыту сродкаў. А магчыма, глыбока не ўнікалі ў сутнасць пытання, не падлічвалі. Атрымліваюць сельсаветы датацыю — ну і добра... Ад гэтага, на мой погляд, трэба адыходзіць.

Наталля КАРПЕНКА.

ВА ЎСЁЙ КРАСЕ

сустрэне Ліда сёлетнія рэспубліканскія «Дажынкі»

Гэтаму будзе садзейнічаць агляд-конкурс па добраўпарадкаванні горада, які пройдзе ў два этапы: з 1 красавіка па 1 чэрвеня і з 1 ліпеня па 30 жніўня, паведаміў намеснік старшыні Лідскага райвыканкама Антон ГЛАЎНІЦКІ.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца жыллёва-камунальныя службы, прамысловыя прадпрыемствы, навучальныя ўстановы, грамадскія і камерцыйныя арганізацыі, усе жыхары горада. Пераможцаў вызначаць у дзевяці намінацыях. У прыватнасці, будзе ацэньвацца каляровае афармленне фасадаў будынкаў і арыгінальнасць рашэнняў пры іх рэканструкцыі, вячэрняй светлавой падсветцы, лепшае прымяненне дэкаратыўных элементаў і малых архітэктурных формаў, скульптур, азеляненне, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый шматпавярховай забудовы і дамоў сядзібнага тыпу.

Грашовыя прэміі пераможцам агляда-конкурсу будуць выплачаныя за кошт сродкаў, атрыманых пры правядзенні раённага суботніка.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У АЎТААМАТАРЫ ПАЙДУ!

НЯХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

За апошнія пяць гадоў у краіне назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя росту колькасці падрыхтаваных вадзіцеляў, канстатуюць у Міністэрстве транспарту і камунікацый. У першую чаргу гэта тлумачыцца значным ростам аўтамабілізацыі насельніцтва і, як вынік, павышаным попытам на гэтую паслугу.

Вучэбныя арганізацыі, што ёсць цяпер, дазваляюць у поўнай меры задавальняць патрэбы насельніцтва ў паслугах па падрыхтоўцы вадзіцеляў, лічаць у міністэрстве. Так, сёння падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў вядуць 480 вучэбных арганізацый, з якіх 32, ці 6,7 працэнта падведамасныя Мінтрансу. За мінулы год колькасць вучэбных арганізацый павялічылася на 62 адзінкі, ці на 15 працэнтаў.

Колькасць аварый па віне маладых вадзіцеляў са стажам кіравання да аднаго года летась зменшылася на 4 працэнты. Гэтая лічба на працягу апошніх пяці гадоў з'яўляецца стабільнай і не перавышае 5 працэнтаў ад агульнай колькасці ўсіх дарожна-транспартных здарэнняў. Кваліфікацыйны экзамен у ДАІ з першай спробы летась здалі 57,8 працэнта выпускнікоў аўташкол, што на 1,2 працэнта больш, чым у 2008 годзе. У вучэбных арганізацыях Мінтранса кваліфікацыйны экзамен у ДАІ з першай спробы здалі 65,2 працэнта выпускнікоў, што на 10,3 працэнта больш, чым годам раней.

Дарэчы, за мінулы год супрацоўнікамі органа па сертыфікацыі аўташкол — УП «Белтэхагляд» — праведзена 684 праверкі вучэбных арганізацый. Па іх выніках 13 вучэбным арганізацыям было адмоўлена ў выдачы сертыфіката адпаведнасці, 8 — у падаўжэнні тэрміну іх дзеяння, 24 — сказана прыпыніць чарговы набор на навучанне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГОДОВАЯ ОТЧЕТНОСТЬ

Открытого акционерного общества «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 79»

220075, г. Минск, ул. Селицкого, д. 27, корп. 2
по состоянию на 1 января 2010 года

Директор – Старосветов Сергей Фёдорович
Главный бухгалтер – Супрун Елена Михайловна

млн руб.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного года
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	101	100 213	126 747
Нематериальные активы	111	60	59
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ I	**190**	**24 131**	**44 408**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	5 110	6 830
В т.ч. сырье, материалы и другие активы	211	2 773	2 883
Готовая продукция и товары для реализации	215	4	3
Товары отгруженные	216	2 238	3 797
Расходы будущих периодов	218	95	141
Налоги по приобретенным активам	220	1 044	1 921
Дебиторская задолженность	240	3 777	3 073
В т.ч. поставщиков и подрядчиков	242	3 183	2 739
По налогам и сборам	243	305	30
Разных дебиторов	245	125	148
Денежные средства	260	803	243
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ II	**290**	**10 749**	**12 101**
БАЛАНС	**300**	**34 880**	**56 509**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	67	67
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	420	-	154
Добавочный фонд	430	8 676	9 216
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	5 425	8 192
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ III	**490**	**14 190**	**17 628**
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	251
Кредиторская задолженность	620	3 321	3 785
В т.ч. перед поставщиками и подрядчиками	621	781	756
Перед покупателями и заказчиками	622	707	936
По оплате труда	623	698	945
По налогам и сборам	625	376	430
По социальному страхованию и обеспечению	626	264	338
Разных кредиторов	628	495	380
Резервы предстоящих расходов	640	-	-
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ IV	**690**	**3 324**	**4 044**
БАЛАНС	**700**	**34 880**	**56 509**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

млн руб.

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	39 741	34 222
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	2 508	2 367
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и других аналогичных обязательных платежей)	020	37 233	31 855
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	30 692	25 305
Валовая прибыль	040	6 541	6 550
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	-	-
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**070**	**6 541**	**6 550**
Прибыль от операционных доходов и расходов	**120**	**198**	**165**
Прибыль от внереализационных доходов и расходов	**160**	**- 1 789**	**- 1 899**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД	**200**	**4 950**	**4 816**
Налог на прибыль	250	1 644	1 536
Прочие налоги и сборы, производимые из прибыли	260	208	306
Прочие насходы и платежи из прибыли	270	10	18
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ	**300**	**3 088**	**2 956**

Количество акционеров, всего – 684 (683 – физические лица, 1 – государство).

Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Ед. изм.	за 2009 год	за 2008 год
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	154,00	148,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	348,00	333,00
Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. руб.	39,69	31,88

Информация о задолженности:

Наименование показателя	Ед. изм.	за 2009 год	за 2008 год
Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	1 621,00	296,00
Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	545,00	975,00

Среднесписочная численность работающих – 783 человека.

Основной вид деятельности: деятельность в области промышленной безопасности (передача в аренду грузоподъемных машин и механизмов с предоставлением услуг по управлению и техническому обслуживанию).

УНП 100090613

Вёскам дораць танометры

У Бялыніцкім раёне праходзіць акцыя «Падары танометр». Яе ініцыятарам выступіў Прэзідыум раённага Савета дэпутатаў.

— У нас створана шмат дамоў сацыяльных паслуг, — растлумачыў ідэю **старшыня Бялыніцкага раённага Савета Мікалай ГУЗНЯКОЎ**. — У вёсках жыве шмат састарэлых людзей, якім трэба ехаць у суседнія паселішчы, дзе ёсць ФАПы, амбулаторыі і бальніцы, каб даведацца пра свой ціск. І ўжо не толькі па самаадчуванні меркаваць, ці прымаць лекі. Таму мы і вырашылі, што варта мець у кожным доме сацыяльных паслуг такое актуальнае медыцынскае прыстасаванне як танометр.

Прэзідыум раённага Савета з заклікам «Падары танометр!» звярнуўся да дэпутатаў, лідараў грамадскіх арганізацый, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. Яны адгукнуліся і ўжо набылі два дзясяткі танометраў. Простыя і самыя надзейныя мадэлі танометраў каштуюць каля 50 тысяч рублёў.

Найбольшую колькасць танометраў падарылі вясковым дамам сацыяльных паслуг два дэпутаты раённага Савета: начальнік Бялыніцкай ПМК-241 Уладзімір Раманенка і старшыня «Калгаса «Радзіма» Аляксандр Лапацентаў.

Апошні раз танометр уручаў дому сацыяльных паслуг у вёсцы Глыбокі Брод Запольскага сельсавета дэпутат, начальнік раённага аддзела адукацыі і лідар раённай арганізацыі «Белая Русь» Мікалай Пашкоўскі. Артур Вільнеўскі, гаспадар дома сацыяльных паслуг, з удзячнасцю прыняў карысны падарунак. Тым больш што ў Глыбокім Бродзе сёння жыве 22 чалавекі, з якіх 20 — пенсіянеры. Як і заўсёды, гаспадара дома сацыяльных паслуг навучылі карыстацца танометрам медыкі: цяпер ён мерае ціск усім аднавяскоўцам, калі ёсць такая патрэба.

Тым не менш яшчэ не ўсе вясковыя дамы сацыяльных паслуг маюць танометры. У раённым Савеце гавораць, што патрэбны яшчэ два дзясяткі медыцынскіх апаратаў — столькі ж, колькі ўжо падорана. Гэтую добрую справу працягне і новы склад Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў, які будзе абраны.

Ілона ІВАНОВА.

САБРАЦЦА З СІЛАМІ.

У тым ліку і з мясцовымі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Добра, што сёння ідзе ад ЖЭСа і ўборка тэрыторыі, і пакос травы, але да тых часоў, пакуль людзі самі не прачнуцца і не ўбачаць, што ўсё навокал належыць ім, што яны самі павінны клапаціцца пра парадак там, гэтая лакальная сітуацыя глабальна не зменіцца. А патэнцыял у мясцовых самаарганізацый — велізарны. Тым больш што ў маёй акрузе ёсць выдатныя ўзоры такога кампактнага пражывання, як мікрараён «Сосны». Большасць жыхароў — у мінулым супрацоўнікі Інстытута ядзернай энергетыкі (галоўны аб'ект працаўладкавання ў мікрараёне). І апроч агульнага пражывання і роду заняткаў, іх яднае і агульны клопат пра адукацыю дзяцей, пра тое, чым заняць іх у пазашкольны час (мы абмяркоўваем, якія для іх арганізаваць гурткі), ёсць таксама агульная зацікаўленасць у навядзенні парадку. Аднак кіраванне жыллёвым фондам у нас не адрэгуляванае ў поўнай меры...

— Як жа садзейнічаюць у гэтым заканадаўцы?

— У мяне яшчэ не было ніводнага прыёму, каб хтосьці з выбаршчыкаў не звярнуўся з жыллёвым пытаннем — ці то па рамонце, ці па добраўпарадкаванні або пастаноўцы на чаргу. Таму адзінага комплекснага дакумента, які стане ісцінай у апошняй інстанцыі па ўсіх гэтых пытаннях, я, напрыклад, чакаю з нецярпеннем. Нарэшце вось, здаецца, у красавіку дачакаемся праекта новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса. Адразу ж уключымся ў работу. Усё ж жыллёвае пытанне для нашага чалавека — самае жыццёвае... У сваёй акрузе я заўжды з'яўляюся першым рухавіком па яго вырашэнні. Аднойчы нават ініцыявала такі своеасаблівы круглы стол — запрасіла ў Авальную залу кіраўніцтва ўсіх жыллёва-камунальных службаў нашага раёна, супрацоўнікаў профільных структур горада, рэспублікі. Атрымалася вельмі зацікаўленая, грунтоўная гутарка. Гэтая дыскусія зрабіла важкі ўнёсак у вырашэнне набалелых праблем.

— Ці здараецца аб'ядноўваць намаганні з мясцовай прадстаўнічай уладай?

— А без гэтага ніяк! У вырашэнні вельмі многіх сацыяльных пытанняў у акрузе дэпутату парламента не проста варта, але ж і неабходна працаваць у тандэме з дэпутатам мясцовага Савета. Рэгулярна бяру ўдзел у пасяджэннях Мінскага гарадскога савета, адміністрацыі Заводскага раёна, дзе актыўна адстойваю законныя інтарэсы маіх выбаршчыкаў. На прыёмах выбаршчыкаў актыўна працавала з дэпутатамі Мінгарсавета, часта сумесна вялі прыёмы. Многія прапановы, што ўзніклі падчас гэтых сумесных сустрэч, знайшлі падтрымку і былі зацверджаныя на сесіях Мінскага гарадскога Савета: па добраўпарадкаванні вуліц, падыходаў, пад'ездаў, капрамонце дамоў, замене дахаў і гэтак далей. Узгодненыя з выканаўчай уладай, яны знайшлі ў далейшым канкрэтную рэалізацыю. І я лічу, што такі сумесны падыход, сумесныя сустрэчы, нейкае супольнае інфармаванне — гэта заўжды карысна. Многія пытанні ўдалося вырашыць дзякуючы сумеснай рабоце са службамі Мінгарвыканкама, адміністрацыяй Заводскага раёна. Я ўвогуле практыкую такую сістэмнасць у рабоце: калі бачу, што за папярэдні прыём назапасілася шмат пытанняў па нейкай сферы, значыць, гэта не адзінкавыя выпадкі, ёсць агульная праблема. Відаць, выпадае нейкае звяно ў сістэме. Тады я звяртаюся непасрэдна да таго, хто за гэты ўчастак адказвае. Пачасціліся, скажам, пытанні па медыцынскім абслугоўванні — запрашаю галоўнага ўрача тамтэйшай паліклінікі, даём аб'яву, і людзі прыходзяць са сваімі праблемамі. І адмахнуцца ад нечага, адмовіць чалавеку ў такіх умовах, калі трэба глядзець у вочы і яму самому, і дэпутату, ужо больш складана, чым калі нехта адзін паскардзіўся ці ліст накіраваў. Я ў сваёй дэпутацкай практыцы, дарэчы, заўжды стараюся з выканаўцам сустрэцца і пагутарыць сам-насам. Тады і танальнасць размовы зусім іншая, і ход справы. Псіхалогія чалавека такая: калі ён бачыць, што ўжо дэпутат да яго прыехаў, значыць, гэта важна, трэба вырашыць.

— І якімі супольнымі перамогамі ўжо можаце пахваліцца?

— Як дэпутат я асабіста ініцыявала (а мяне падтрымалі ЖРЭА, адміністрацыя раёна) рэканструкцыю дваровай тэрыторыі па вуліцы Несцерава. Там не толькі ўладкуюць саму тэрыторыю, абсталююць дзіцячыя пляцоўкі, але і зробяць міні-паркоўку, пашыраць праезную частку. Гэта дасць магчымасць службам медыцынскай дапамогі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі пад'ехаць да дамоў, раз'ехацца там, бо раней з гэтым былі сур'ёзныя праблемы. Проста, калі гэтыя дамы будаваліся, на такую колькасць машын, як цяпер, ніхто не разлічваў. Сёння ж на кожную кватэру па дзве машыны прыходзіцца дакладна, а тое і па тры... У Шабанах жыхары вуліцы Ротмістрава скардзіліся на шум і пыл ад тамтэйшага прадпрыемства па перапрацоўцы адходаў асфальту. Я падключыла раённыя і гарадскія службы санэпідэмстанцыі, мы перанеслі на пэўную адлегласць гэтую драбілку, а сёння ўжо рыхтуецца рашэнне гарвыканкама пра тое, каб яна наогул была вынесеная адтуль. Мікрараён і так у экалагічным плане вельмі няпросты, а яшчэ і такія дробныя прадпрыемствы, якія дадаюць шкодных выкідаў у асяроддзе... Так што тут трэба цвёрда стаяць на варце інтарэсаў людзей.

Нядаўна дапамаглі таксама жыхарам вуліцы Байкальскай. У іх там калі будавалася МКАД, не паставілі шумапаглынальныя канструкцыі. І цяпер, калі кальцавая стала такой нагружанай магістраллю, людзі, асабліва ў начны час, адчуваюць каласальныя нязручнасці. Мы ініцыявалі спецыяльныя замеры. І яны паказалі, што сапраўды ўзровень шуму перасягае дапушчальныя нормы. Мы дабіліся прынцыповага рашэння гарвыканкама — ахоўныя канструкцыі будуць усталяваныя. Спадзяюся, што ўсё будзе зроблена своечасова. Сумесна з адміністрацыяй раёна своечасова зрабілі захады, каб змяніць праект будаўніцтва лазнева-пральнага камбіната ў Шабанах у адпаведнасці з просьбамі жыхароў. У тандэме дабіліся і вырашэння праблемы газіфікацыі пасёлка Малы Трасцянец. Мне не хацелася б зводзіць усё гэта да банальнага пералічэння: за ўсімі гэтымі «дробязямі» стаяць жывыя людзі са сваімі праблемамі і перажываннямі, радасцямі і дасягненнямі. І ўсе мы — заканадаўцы і выканаўцы — робім агульную справу. Важна проста ўмець пачуць адзін аднаго і пастукацца ў патрэбныя дзверы...

Зоя ВАРАНЦОВА.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Радавыя Перамогі

З 1,5 МІЛЬЁНА ПАХАВАНЫХ У БЕЛАРУСІ САЛДАТ ВЫСВЕТЛЕНЫ АСОБЫ ТОЛЬКІ 400 ТЫСЯЧ

«Звязда» разабралася, хто займаецца сёння ваенным пошукам у Беларусі і як ідуць справы ў гэтай галіне

ЗАГАДЧЫК філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея «Дом-музей І з'езда РСДРП» Сяргей БЯСПАНСКІ па сумяшчальніцтве — старшыня пошукавага клуба «Віккру-Мінск». На нядаўняй канферэнцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў спадар Сяргей рабіў надзвычай цікавы даклад: які пошук існуе сёння ў Беларусі. Каб пагаварыць пра гэта больш грунтоўна, мы сустрэліся ў ягоным кабінеце, на падстрэшшы Дома-музея І з'езда РСДРП. Як высветлілася, пошук — справа далёка неадназначная, не заўсёды законная, часам вельмі небяспечная. Да таго ж, цяпер, калі любы чалавек можа прыбадаць за 300 долараў металашукальнік — незаконны пошук наносіць сапраўдную шкоду дзяржаўным музеям...

«У бой ішло 1500 салдат, выходзіла 20»

— Спадар Сяргей, калі вы гаворыце пра пошук, што вы маеце на ўвазе? Давайце спачатку вызначымся: не хто шукае, а што шукаюць.

— У агульнай свядомасці пошук кранае часы Другой сусветнай вайны: «чырвоныя следапыты», піянеры, школьнікі, якія даследуюць лёс чырвонаармейцаў, што загінулі ў той вайне. Але калі чалавек заглыбляецца ў тэму, ён разумее, што пошук як сама зямля: першы пласт — апошняя вайна, далей — Грамадзянская, далей — Першая сусветная, Напалеонаўская, Шведскі патоп...

— Па сутнасці, як археалогія, толькі з вайсковым ухілам?

— Так. У Расіі нават тэрмін такі ўводзяць — «ваенная археалогія», нават часопіс выходзіць з такой назвай. У нас пакуль такога няма. Напэўна, гэта нейкая дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая ва ўмовах Беларусі мае права на жыццё. Бо ў нас такая складаная вайсковая гісторыя — з часоў нарманаў-вікінгаў і да сучаснасці...

— Але, наколькі я разумею, збольшага гэта ахоплівае XX стагоддзе і дзве асноўныя вайны?

— Так, бо ад іх шмат што засталося ў зямлі. Да таго ж, усё ранейшае — гэта спецыфічна, гэта ўжо археалогія, калекцыйныя такія рэчы. А наш пошук — гэта мемарыяльная рэч, гэта высвятленне чалавечых лёсаў. Шукальнікі шукаюць лёсы асобы, чалавека. Не войскаў, не насельніцтва, а канкрэтна — Якімовіча, Тарасевіча, Стасевіча. Шукаюць яго лёс і шукаюць сваякоў, каб ім гэта распавесці. Гэта гуманітарная рэч, якая праз асобных людзей далучае нас да гісторыі сваёй краіны. Тое, што прапускаюць праз сэрца і праз думкі.

— Але, напэўна, асабістых рэчаў менш, чым проста стрэльбаў, патронаў, касак... Што можна аднесці да асабістых рэчаў, якія захоўвае зямля?

— Жэтон, узнагароды, нейкія асабістыя рэчы з надпісамі — партсігар, рэмень...

— Узнагароды ж большасцю сваёй былі нумарованыя — і можна высветліць уладальніка?

— Знайсці ўзнагароду — гэта вялікая ўдача, бо па нумары адразу можна даведацца імя байца. Высветліць імя байца — гэта вялікая рэдкасць! За 15 гадоў мы паднялі 150 парэшткаў байцоў, з іх вызначылі толькі 18 асобаў. Вось прапорцыя.

— Кожны дзясяты... Сапраўды, не густа...

— Тут дае знак досвед вайскоўцаў. Жаўнерам раздавалі «смяротныя медальёны». Але часцяком людзі былі непісьменныя — і шмат хто не запаўняў. Іншая дэталь: была такая пагудка, што калі запоўніш — дык цябе заб'юць. І хацелі такім чынам свой лёс падмануць.

— А чаму вайскоўцы мусілі самі запаўняць?

— Такі быў парадак. Раздаваў старшына ці сяржант там. І, па вялікім рахунку, мусіў пасля праверыць, ці ўсе запомнілі. Але з такімі прымхамі — дзе ж ты праверыш.

Такія знаходкі неабходна здаваць у праваахоўныя органы!

Ды, пэўна, і не да гэтага часам было... Так і гінулі з незапоўненымі, так і ляжаць цяпер безыменныя...

— Гляджу карцінку ў вашым буклеце — і для мяне адкрыццё, што «смяротныя медальёны» былі папяровыя...

— Так, у ім было дзве паловы — адну пахавальная каманда мусіла здаць у штаб, другую пакінуць з парэшткамі. І гэтыя папяровыя жэтоны — цэлая бяда. Самі разумееце, што робіць з паперай час і зямля. Хоць іх пасля і замянілі чырвонаармейскай кніжкай, сэнс застаўся.

— А чаму папяровы — а не бляшаны, як у жаўнераў іншых краінаў? Эканомія?

— Напэўна, гэта сам падыход да чалавечых жыццяў і асобаў. Мільён туды, мільён сюды...

— Я ў адной савецкай ваеннай кнізе чытаў, што калі 60 % жаўнераў загінула — гэта лічыўся паспяховы бой...

— Я бачыў архіўныя матэрыялы, якія датычацца баявых дзеянняў ва Усходняй Беларусі 1943 года. Там увогуле ў бой ішло 1500 салдат, выходзіла 20... У гарачыя часы сярэднясуткавыя ахвяры Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі — 20 тысяч салдат...

«Чорныя капальнікі знайшлі ўнікальныя дакументы, пакорпаліся — і выкінулі...»

— Калі мы акрэслілі, што ваш пошук — гэта XX стагоддзе, што ад якой вайны рэальна знайсці?

— Зямля захавала вельмі шмат!.. Звычайна, баявыя ахвяры, як яны загінулі — так яны і захаваліся да сёння. Зразумела, ад цела чалавека не застаецца практычна нічога. А рыштунак, зброя, медалі, грошы... Калі гэта быў збіты самалёт — і трапіў у наша тарфяное балота, дык ён практычна цалкам захаваўся. Апошні раз падымалі ІЛ-штурмавік, дык нават папяровыя грошы 1943 года знайшлі.

— Вы пералічылі рэчы, якія можна прадбачыць. А што з незвычайнага траплялася?

— Знайшлі аднойчы бутэльку, і нават з вадой — 1941 года! Яна была моцна закаркаваная, таму захавалася. Здалі ў мясцовы музей. А самая незвычайная знаходка была — гэта сейф 20-га механізаванага корпуса Чырвонай Арміі, які быў закапаны ў зямлю пад Чавусамі ў ліпені 1941 года. Корпус пачынаў ваенныя дзеянні пад Негарэлым, праходзіў праз Бярэзіну, Свіслач, Бабруйск і пад Магілёў, прымаў удзел у абароне Магілёва. Трапіў у акружэнне пад Чавусамі — і растварыўся... Яго яшчэ ў жніўні спісалі з рахунку Чырвонай Арміі — бо не вынеслі баявыя сцягі... І недзе ў 2004 годзе нам патэлефанавалі і сказалі, што знайшлі нейкую скрыню, а там нейкія паперкі. Мы хуценька за свае грошы ўзялі машыну — і паехалі глядзець. Сапраўды, чорнымі капальнікамі былі ўзнятыя скрыні, нам паказалі гэтае месца. І мы ашалелі, што гэта за паперкі — баявыя данясенні 20-га механізаванага корпуса, прадстаўленні байцоў да ўзнагародаў... А гэта ж 1941 год — і кожная ўзнагарода на крыві... Яны ж не проста адыходзілі, беглі з Мінска да Магілёва — яны змагаліся... Таксама там быў надзвычай каштоўны спіс стратаў — хто дзе загінуў. Найкаштоўнейшыя звесткі!.. Мы, што змаглі, расчыталі, надрукавалі гэты спіс, перадалі яго ва Упраўленне па ўшанаванні памяці Міністэрства абароны. І такіх знаходак я не ведаю больш на постсавецкай прасторы.

— Атрымліваецца, яны гэты сейф спецыяльна закапалі, каб захаваць?

— Так, бо апроч папераў там, выходзіць, былі і баявыя знамёны — засталася труха. Напэўна, разумелі, што не выйдуць з акружэння — і каб ворагу не дасталося, вырашылі закапаць.

— Вы сказалі, што чорныя капальнікі знайшлі. А як удалося даведацца?

— Нам шапнулі. Ім нашто гэтыя паперы? Іх іншае цікавіць — што можна прадаць, а гэта асабліва не прадасі. Пакорпаліся — і выкінулі.

«Значная частка брацкіх магілаў — пустыя»

— Спадар Сяргей, многія чулі пра славу Шклоўскага пошукавага атрада — яны дастаюць з балотаў танкі, іншую тэхніку. Вы такім не займаецеся?

— Пошук узнік стыхійна пасля распаду Савецкага Саюза. Дагэтуль зямля была пад «жорсткім партыйным наглядам». Але калі знік прэс афіцыйнай цэнзуры, пачаліся пытанні 1941 года, 1942 года... І ва ўсіх баявых раёнах Савецкага Саюза пачаўся такі аматарскі рух пошуку — гэта была грамадская ініцыятыва. І пайшло з зямлі тое, што неяк прыхоўвалася ў савецкія часы — колькасць ахвяраў. Мы ж былі выхаваныя, што «ніхто не забыты, нішто не забыта». Калі сталі даследаваць, выявілася, што толькі на тэрыторыі Беларусі пахавана каля 1,5 мільёна байцоў Чырвонай Арміі, з якіх толькі (!!!) 400 тысяч апазнаныя! І пачаліся ў 1990-я гады аматарскія клубы, якія і сталі займацца гэтай працай. Паралельна сталі займацца і чорныя капальнікі — бо зямля апынулася як бы нічыя... У тыя часы мы панеслі вялізныя страты, бо спрытнюгі выкарысталі момант — і шмат чаго знойдзенага пайшло міма дзяржаўных фондаў... Пасля ўжо было створана Упраўленне па ўшанаванні памяці пры Міністэрстве абароны, пасля быў створаны асобны 52-і пошукавы батальён — адзіны такі батальён на постсавецкай прасторы.

— З 1,5 мільёна — 400 тысяч... Няўжо паперы такога кшталту, як у знойдзеным сейфе, настолькі не захаваліся?

— Тое, што не было вынесена з баёў — загінула назаўжды. Ёсць і іншы момант — усе архівы ваенкаматаў мэтанакіравана былі знішчаны — выходзіць, каб схаваць праўдзівую колькасць ахвяраў. Не ўсе ведаюць, што значная частка брацкіх магілаў — пустыя. Неаднаразова ў нас бывала так, калі мы знаходзілі парэшткі байцоў — і яны лічыліся пахаванымі ў нейкай брацкай магіле зусім у іншым месцы. Мы тады гэтыя парэшткі хавалі менавіта там, дзе было напісана — каб хоць адпавядала...

— На жаль, у тэме пошуку мы часта чуем пра тэму «чорных капальнікаў». Гэта вялікая праблема?

— Гэта велізарная праблема!.. З'ява шкодная і маштабная — яны закранулі кожны раён Беларусі. Шкоду яны наносяць агромністую! Тое, чым яны займаюцца — гэта крадзеж у мёртвых. Што лічыцца непрымальным ва ўсіх культурах. Жывуць яны з таго, што калекцыянеры плацяць ім грошы за знаходкі. Капальнікаў цікавіць зброя, узнагароды, вайсковы рыштунак. У інтэрнэце ёсць агромністыя сайты, дзе яны выхваляюцца адно перад адным знаходкамі. Шкада, вельмі шкада, што нашы праваахоўныя органы надаюць гэтаму недастатковую ўвагу. Бо з сучаснымі тэхналогіямі вылічыць гэтых людзей — нескладана...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота з архіва клуба «Віккру-Мінск».

Сяргей БЯСПАНСКІ падчас пошукаў самалёта ў тарфяным балоце.

МАЙ НА ЎВАЗЕ
Хто можа корпацца ў зямлі?

Афіцыйна — толькі 52-і пошукавы батальён, а таксама некалькі іншых арганізацый, у якіх ёсць на тое ліцэнзія. Астатняе — парушэнне. Пошукавы клуб «Віккру-Мінск», напрыклад, праводзіць раскопкі толькі ў прысутнасці службоўцаў з 52-га пошукавага батальёна.

Іншая рэч, калі вы выбіралі бульбу — і знайшлі снарад, не бойцеся выклікаць сапёраў — гэта лічыцца выпадковымі знаходкамі. Калі знайшлі нешта іншае, каску ці якія гільзы, прапануйце ў экспазіцыю бліжэйшаму краязнаўчаму музею. Калі скажуць, што такога дабра хапае — пакіньце сабе на памяць.

Часам пошук — гэта ныранне ў рэкі і балоты.

ЯКІ ІСНУЕ ПОШУК У БЕЛАРУСІ

Увесь пошук у Беларусі ўмоўна дзеліцца на 2 вялікія групы: дзяржаўны і грамадскі.

ДЗЯРЖАЎНЫ ажыццяўляецца на прафесійнай аснове — людзі працуюць за заробак.

1. **52-і пошукавы батальён.** Спецыялізуецца менавіта на пошуку рэштак ахвяраў вайны.

2. **КДБ.** Рассакрэчваюцца матэрыялы пра ваеннапалонных — у супрацы з нямецкай грамадскай арганізацыяй «Саксонскі мемарыял» ужо апрацаваныя 20 000 спраў, вызначаныя 12 000 імёнаў — хто з ураджэнцаў Беларусі пахаваны ў Нямеччыне. Гэта надзвычай каштоўная інфармацыя для сваякоў — ведаць, дзе пахаваны твой бацька, дзед...

3. **Музейны пошук.** Ім займаюцца спецыфікаваныя музеі — Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны гістарычны музей, Музей гісторыі Брэсцкай крэпасці, абласныя краязнаўчыя музеі. Навукоўцы, кожны па сваёй тэме, вядуць пошукавую працу: навукова-даследчую, пра ўдзел у вайне сваіх землякоў, якія загінулі.

4. **Архіўны пошук.** Большасць матэрыялаў сканцэнтраваная ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны СССР у Падольску. Неверагодна, але супрацоўнікі архіва аблічбавалі і вывесілі на сайт 20 мільёнаў асабістых справаў! **ПАЗНАЧЦЕ КАРЫСНЫ АДРАС: www.obd-memorial.ru**

ГРАМАДСКІ ПОШУК

1. **Сямейны пошук.** Страты Чырвонай Арміі — 14 мільёнаў салдат, з якіх 7 мільёнаў дагэтуль лічацца зніклымі без вестак. Зразумела, многія сем'і хочуць даведацца, дзе пахаваныя продкі — удзельнікі вайны.

2. **Педагагічны пошук.** Такім чынам школы і іншыя навучальныя ўстановы далучаюць вучняў да гісторыі, вучаць патрыятызму, гуманізму. З 1992 па 2007 год усе школьныя пошукавыя атрады былі аб'яднаныя ў рэспубліканскую асацыяцыю «Пошук», якая налічвала каля 2000 актыўных сяброў. Пасля яна знікла. Бо вайскоўцы катэгарычна супраць удзелу ў пошукавых мерапрыемствах дзяцей. Напэўна, яны маюць рацыю. Сяргей Бяспанскі расказвае, як сам некалі корпаўся са школьнікамі ў зямлі. Пакорпаліся — і пайшлі. А калі месца потым праверылі сапёры — там аказалася шэсць снарадаў... Больш спадар Сяргей такую адказнасць на сябе браць не хоча. Да таго ж, па спрадвечных народных традыцыях судакранацца са смерцю можа толькі той, хто ўжо нарадзіў дзіця...

3. **Ліцэнзаваны пошук.** Аматарскія групы атрымалі ліцэнзіі і законна праводзяць пошук. Гэта славуты Шклоўскі пошукавы атрад, які падымае з балот цяжкую тэхніку, атрад «Памяць Афгана», пошукавы атрад Музея авіяцыі.

4. **Замежны пошук.** На сталай аснове працуюць прадстаўнікі Народнага саюза Германіі, якія вышукваюць і ўпарадкоўваюць пахаванні вермахта — па іх звестках у нас пахаваны 200 тысяч нямецкіх салдат. Гэта кранае выключна звычайных вайскоўцаў. Карнікі і эсэсаўцы лічацца злачынцамі — іх магілы ўшаноўваць забаронена.

5. **Аматарскі пошук.** Вядзецца арганізацыямі, якім гэта цікава. Звычай гэта сталыя людзі, у многім — былыя вайскоўцы.

6. **Калекцыйны пошук.** Аматары гісторыі, якія для сваёй калекцыі шукаюць артэфакты ў зямлі. Дзейнічаюць незаконна.

7. **Чорныя капальнікі.** Марадзёры, якія рабуюць вайсковыя магілы. Дзейнічаюць незаконна. Калі вам стала вядома пра такія выпадкі — неадкладна паведамляйце ў міліцыю!

Утерянные страховые полиса обязательного страхования ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии АЖ № 3023040, № 3545141, № 3545145, № 3545149, № 3545150, № 3565964, с № 6674115 по № 6674130, страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу форма 2РП2РН серии БМ № 0126500, № 0195200, № 0163551, с № 0163572 по № 0163574, с № 0195012 по № 0195019, квитанции о приеме наличных денежных средств форма 1-СУ серии КВ № 4133181, № 4133183, № 4133185, № 4133187, страховой полис универсальный формы 2РН2РП серии БК с № 0031632 по № 0031640 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительными.**

Утерянные страховые полисы обязательного страхования ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии АЖ № 6674131, страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу форма 2РП2РН серии БМ № 0195139 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительными.**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

млн руб.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	113009	129662
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, работ, услуг	011	17186	20227
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	020	95823	109435
Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	89926	101687
Валовая прибыль	040	5897	7748
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060		
Прибыль (убыток) от реализации	070	5897	7748
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	6000	9126
Налоги, включаемые в операционные доходы	081	867	1380
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	090	5133	7746
В том числе:			
Проценты к получению	091		17
Доходы от участия в создании других организаций	092		
Доходы от операций с активами	093	5133	7729
Прочие операционные доходы	099		
Операционные расходы	100	5042	7121
В том числе:			
Проценты к уплате	101		
Расходы от операций с активами	102	4794	7121
Прочие операционные расходы	109	248	
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	**120**	**91**	**625**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	651	1157
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	131	32	5
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	140	619	1152
Внереализационные расходы	150	2112	3174
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	**160**	**-1493**	**-2022**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**200**	**4495**	**6351**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	954	1534
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	**240**	**5449**	**7885**
Налог на прибыль	**250**	**1117**	**1884**
Налоги и сборы, производимые из прибыли	**260**	**353**	**801**
Прочие платежи и расходы из прибыли	**270**	**10**	**41**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**300**	**3015**	**3625**
Справочно (из строки 300). Сумма льготы по налогу на прибыль	310	505	290

Данные отчетности подтверждены (наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)	Бухгалтерская отчетность ОАО «ДСТ № 3» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2010 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год (ОДО «АУДИТ-ОЛТА» лицензия № 02200/0495757)

Кол-во акционеров	Всего	882	В том числе:	Юридических лиц	2	Физических лиц	880

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Миллионов рублей	269,3	342,1
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Рублей	290,197	368,650
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тысяч рублей	47,79	48,1
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	Штук	нет	нет
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	Миллионов рублей		
Просроченная кредиторская задолженность	Миллионов рублей		
Среднесписочная численность работающих (человек)		1093	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		капитальный и средний ремонт автомобильных и железных дорог, взлетно-посадочных полос	

Генеральный директор **Г.С. Тимофеев**

Главный бухгалтер **Е.А. Емельянова**

ИНФОРМАЦИЯ
о результатах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» за 2009 г.

Адрес: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23. Т/ф. 28 41 00.**
Генеральный директор: **Тимофеев Григорий Семенович**
Главный бухгалтер: **Емельянова Екатерина Адамовна**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

млн руб.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	41292	45425
Нематериальные активы	120	113	37
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	1237	195
В том числе: незавершенное строительство	141		
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	**190**	**43279**	**45657**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	12472	9289
В том числе:			
сырье, материалы и другие активы	211	8959	8038
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	2190	422
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215	93	216
товары отгруженные	216		
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	1230	613
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным активам	220	156	138
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	5453	5001
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241	2081	3496
поставщиков и подрядчиков	242	1588	724
по налогам и сборам	243	1502	537
по расчетам с персоналом	244	57	58
разных дебиторов	245	225	186
прочая дебиторская задолженность	247		
Расчеты с учредителями	250		
В том числе:			
по вкладам в уставный фонд	251		
прочие	252		
Денежные средства	260	860	813
В том числе:			
денежные средства на депозитных счетах	261		
Финансовые вложения	270	7	12
Прочие оборотные активы	280	1	11
ИТОГО по подразделу II	**290**	**18949**	**15264**
БАЛАНС	**300**	**62228**	**60921**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	21342	21342
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	452	589
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	452	589
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд	430	17162	21614
Прибыль (убыток) отчетного периода	440		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	1051	1343
Целевое финансирование	460	1933	2088
Доходы будущих периодов	470		
ИТОГО по разделу III	**490**	**41940**	**46976**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	4431	1595
Прочие долгосрочные обязательства	520	894	710
ИТОГО по разделу IV		5325	2305
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	4502	5304
Кредиторская задолженность	620	10461	6309
В том числе:			
расчеты с поставщиками и подрядчиками	621	7635	3337
перед покупателями и заказчиками	622	473	839
расчеты по оплате труда	623	1431	1208
расчеты с персоналом	624	6	3
расчеты по налогам и сборам	625	309	338
расчеты по социальному страхованию и обеспечению	626	440	378
Задолженность перед учредителями	630		
В том числе:			
по выплате доходов, дивидендов	631		
прочая задолженность	632		
Резервы предстоящих расходов	640		27
ИТОГО по разделу V	**690**	**14963**	**11640**
БАЛАНС	**600**	**62228**	**60921**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства жилого дома № 2 (по генплану) в районе пересечения ул. Нестерова – МКАД)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30–16.15, обед – 12.45–13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 64 по ул. Червякова.
2. Жилой дом № 32 по ул. Янковского.
3. Жилой дом № 42 по ул. Янковского.

Лицензия № 02250/0589508 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь на основании решения № 20 от 25.01.2010 г. и действительна до 28.02.2015 г.

Информация о проекте строительства:

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству жилых помещений не менее 40 % работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы.

Начало строительства 1 квартал 2010 г., ввод дома в эксплуатацию – 4-й квартал 2010 г., благоустройство и озеленение прилегающей территории – 2-й квартал 2011 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 1886-5/09 от 20 ноября 2009 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Заводской район, в районе пересечения ул. Нестерова – МКАД, жилой дом № 2 по генплану.

Характеристика объекта.

Объект – 132-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-111-90 с помещением товарищества собственников. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с работниками ОАО «МАПИД», нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ. Остальные квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза, ванной и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные – железобетонные трехслойные панели толщиной 300 мм с утеплителем из полистирольного пенопласта, внутренние – сборные железобетонные панели толщиной 160 мм из тяжелого бетона.

Перекрытия – железобетонные.

Крыша – мягкая рулонная.

Окна – деревянные с двумя рядами остекления со стеклопакетом.

Двери наружные (в квартирах) – щитовые.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Цены на объекты долевого строительства.

Стоимость 1м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации:

для работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий – **2 628 000 руб.**;

для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий:

однокомнатные, двухкомнатные квартиры – **2 960 000 руб.**

трехкомнатные квартиры – **2 852 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 2783(2) от 26 ноября 2009 г., свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 05 января 2010 г. № 500/1109-632. Площадь земельного участка – 0,1514 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 132.

Нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества, нет.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

Помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 4 квартал 2010 г., благоустройство и озеленение прилегающей территории – 2-й квартал 2011 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решений Мингорисполкома № 2201 от 18 сентября 2008 г., № 2783(2) от 26 ноября 2009 г., № 377 от 18 февраля 2010 г. собственными силами без заключения договоров подряда, в том числе с привлечением к строительству жилых помещений не менее 40 % работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 396 от 15 июня 2006 г. Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 31 (тридцать одна) следующая квартира:

1. **Однокомнатные** №№ 36 (6 этаж), 38 (6 этаж), 40 (6 этаж), 50 (8 этаж), 52 (8 этаж), 54 (8 этаж) – общей площадью 45,42 м², жилой площадью 17,96 м² – по цене 134 443 200 руб. за квартиру.

2. **Однокомнатные** №№ 57 (9 этаж), 64 (10 этаж), 66 (10 этаж), 68 (10 этаж), 71 (11 этаж), 73 (11 этаж), 75 (11 этаж), 78 (12 этаж), 80 (12 этаж), 82 (12 этаж), 85 (13 этаж), 87 (13 этаж), 89 (13 этаж) – общей площадью 45,17 м², жилой площадью 17,96 м² – по цене 133 703 200 руб. за квартиру.

3. **Двухкомнатные** №№ 28 (5 этаж), 35 (6 этаж), 37 (6 этаж), 49 (8 этаж), 51 (8 этаж), 53 (8 этаж) – общей площадью 60,82 м², жилой площадью 31,09 м² – по цене 180 027 200 руб. за квартиру.

4. **Двухкомнатные** №№ 63 (10 этаж), 77 (12 этаж) – общей площадью 60,57 м², жилой площадью 31,09 м² – по цене 179 287 200 руб. за квартиру.

5. **Трехкомнатные** №№ 41 (6 этаж), 55 (8 этаж) – общей площадью 78,23 м², жилой площадью 45,1 м² – по цене 223 111 960 руб. за квартиру.

6. **Трехкомнатные** №№ 69 (10 этаж), 83 (12 этаж) – общей площадью 77,98 м², жилой площадью 45,1 м² – по цене 222 398 960 руб. за квартиру.

Для работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 47 (сорок семь) следующих квартир:

1. **Однокомнатные** №№ 15 (3 этаж), 17 (3 этаж), 29 (5 этаж), 31 (5 этаж), 33 (5 этаж), 43 (7 этаж), 45 (7 этаж), 47 (7 этаж) – общей площадью 45,42 м², жилой площадью 17,96 м² – по цене 119 363 760 руб. за квартиру.

2. **Однокомнатные** №№ 59 (9 этаж), 61 (9 этаж) – общей площадью 45,17 м², жилой площадью 17,96 м² – по цене 118 706 760 руб. за квартиру.

3. **Двухкомнатные** №№ 9 (2 этаж), 11 (2 этаж), 14 (3 этаж), 16 (3 этаж), 18 (3 этаж), 30 (5 этаж), 32 (5 этаж), 39 (6 этаж), 42 (7 этаж), 46 (7 этаж) – общей площадью 60,82 м², жилой площадью 31,09 м² – по цене 159 834 960 руб. за квартиру.

4. **Двухкомнатные** №№ 56 (9 этаж), 58 (9 этаж), 60 (9 этаж), 65 (10 этаж), 67 (10 этаж), 70 (11 этаж), 72 (11 этаж), 74 (11 этаж), 79 (12 этаж), 81 (12 этаж), 84 (13 этаж), 86 (13 этаж), 88 (13 этаж), 98 (15 этаж), 112 (17 этаж) – общей площадью 60,57 м², жилой площадью 31,09 м² – по цене 159 177 960 руб. за квартиру.

5. **Двухкомнатные** №№ 100 (15 этаж), 107 (16 этаж), 109 (16 эт

Генеральны дырэктар КВУП «Гомельаблцепласетка» Дзмітрый ЗГУРСКІ:

«НАША ЗАДАЧА — СТВАРАЦЬ КАМФОРТ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА»

Знаёмім з суразмоўцам

Карэнны гамяльчанін. Сярэднюю школу і вышэйшую навучальную ўстанову — політэхнічны інстытут заканчваў у родным горадзе. Гэта быў другі па ліку выпуск ВНУ па спецыяльнасці «прамысловая энергетыка», якую атрымаў Дзмітрый Аляксеевіч. Першае месца працы ў яго — кацельня адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельдрэў», якая была адной з самых буйных у горадзе, на пасадзе памочніка майстра. А потым, як кажуць, пачалося ўзыходжанне маладога, стараннага і энергічнага спецыяліста па службовай лесвіцы: майстар змены, начальнік парасілавога цэха, галоўны інжынер «Гомельдрэва». У 2006 годзе Дзмітрый Аляксеевіч быў прызначаны на пасаду генеральнага дырэктара камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельаблцепласетка».

— Трэцім Усебеларускім Сходам была вызначана асноўная мэта развіцця нашай краіны — будаўніцтва дзяржавы для народа. У яе рэалізацыю, як вядома, немалы ўнёсак робяць і работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі па стабільным забеспячэнні насельніцтва і іншых спажыўцоў якаснымі паслугамі. Да гэтай сферы адносіцца і ваша прадпрыемства, калектыў якога пацвердзіў здольнасць паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы. У першую чаргу мы маем на ўвазе тое, што калегія ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці, разгледзеўшы вынікі работы арганізацый, што ўваходзяць у сістэму ўпраўлення, прысудзіла вашаму калектыву першае месца ў сваёй падгрупе па выніках работы за 2009 год. З чым вас віншуем і зычым надалей браць новыя вышыні. Што ў сувязі з гэтым вы хацелі б сказаць?

— Па-першае, вам дзякуй. Па-другое, хацеў бы падзякаваць напярэдадні нашага прафесійнага свята ўсіх нашых работнікаў, незалежна ад іх пасад, за тое, што яны працавалі старанна, самаадданa, праяўляючы ініцыятыву, і рабілі свой асабісты ўнёсак у агульную справу.

— Па якой прычыне?

— Частка кацельняў працуе толькі ў ацяпляльны перыяд, і таму мы набіраем на яго сезонных рабочых. Адсюль — павелічэнне персаналу ў асенне-зімовы перыяд. Заўважу таксама, што ў калектыве працуе вялікая колькасць жанчын — да 35 працэнтаў.

— Іншым разам, Дзмітрый Аляксеевіч, даводзіцца бываць на кацельнях не толькі вашага прадпрыемства, але і ў раёнах і здзіўляешся, што там большай часткай працуюць менавіта жанчыны. Ёсць у гэтым нейкая логіка ці не?

— Што, дзе і як на раёнах (усміхаецца), меркаваць не буду, толькі скажу, што вы гэта правільна падмецілі наконт работы жанчын на кацельнях, асабліва на тых, дзе выкарыстоўваюцца мясцовыя віды паліва. Мужчыны там працаваць не любяць, бо цяжка тыя дровы цягаць да топкі, таму што механізаванай падачы іх няма. А жанчыны — нічога, спраўляюцца. Такі ўжо ў іх характар, што як казаў паэт, яны і каня на скаку спыняць, і ў падпаленую хату ўвойдуць.

Яшчэ раз пра калектыў хачу сказаць пахвальнае слова. Ён сфарміраваўся даўно, мае свае пэўныя традыцыі. Гэта сплаў вопыту старэйшых і энтузіязму моладзі, якой апошнім часам на прадпрыемстве стала больш. Мы не сумняваемся, што маладыя людзі стануць добрымі спецыялістамі сваёй справы і падымуць прадпрыемства на больш высокі ўзровень.

— Ваша прадпрыемства называецца КВУП (камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства) «Гомельаблцепласетка», і гэтым сказана ўся сутнасць вашай работы. Што б вы хацелі да гэтага дадаць?

— Бадай, тое, што мы павінны клапаціцца пра тое, каб людзі ў сваіх кватэрах і дамах адчувалі сябе камфортна, каб там у кранах была гарачая вада, каб у жыллі было цёпла. З гэтай мэтай мы абслугоўваем—эксплуатуем кацельні і цеплавыя сеткі. Выконваем і шэраг іншых работ. 99 працэнтаў нашых аб'ектаў знаходзіцца ў абласным цэнтры.

На балансе прадпрыемства 24 кацельні рознай магутнасці. Большасць — ад трох да дзесяці гігакалорый. Самая буйная знаходзіцца ў Навабеліцкім раёне Гомеля, якая ажыццяўляе падачу цяпла палавіне раёна. Гэта — былая кацельня вытворчага аб'яднання «Крышталь», якая была перададзена нам у пачатку гэтага стагоддзя. Агульная яе магутнасць — 70 гігакалорый. У хуткім часе яна будзе рэканструявана ў сувязі з далейшым развіццём горада.

— Калі ўжо зайшла гаворка пра работу кацельняў, дык як там выкарыстоўваюцца мясцовыя віды паліва?

— Тэма гэта актуальная, і калі мы пачыналі яе рэалізоўваць, нам была пастаўлена задача перавесці 22 кацельні на дровы ці шчэпкі. Гэта ў асноўным — кацельні невялікія, магутнасцю ад 0,2 да 5 гігакалорый. Цяпер ідзе ліквідацыя малых стратных кацельняў. А гэта азначае, што мы пераключаем іх на сістэму Міністэрства энергетыкі і тым самым і для спажыўцоў паляпшаем цеплазабеспячэнне, і дасягаем большай эфектыўнасці работы ў эканамічным плане.

Цяпер на год мы нарыхтоўваем 5400 кубаметраў драўніны і спальваем яе, дасягаючы 1600 тон умоўнага паліва. Дровы нарыхтоўваем самастойна, для чаго створаны ўчастак, дзе працуе 13 чалавек, ёсць неабходная тэхніка.

— Другі бок вашай дзейнасці, Дзмітрый Аляксеевіч, цеплавыя сеткі...

— Іх на балансе прадпрыемства больш як 600 кіламетраў, і яны з'яўляюцца носьбітамі не толькі цяпла, але і гарачай вады. І калі гаварыць пра падзел па гэтым пытанні з сістэмай Мінэнерга, то іх цепласеткі ў асноўным з'яўляюцца магістральнымі, а нашы — размеркавальныя, з цэнтральнымі цеплавымі пунктамі. Гэта значыць, што яны ў большай ступені ўнутрыквартальныя і сеткі ад нашых крыніц цяпла. Цэнтральных цеплавых пунктаў у нас 98. Туды паступае пітная вада, якую мы падаграваем да пэўнай тэмпературы з дапамогай цепланосьбіта рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельэнерга», пасля чаго яна ідзе да жыхароў дамоў і кватэр.

— А ці выпрацоўвае ваша прадпрыемства электраэнергію?

— Не, не выпрацоўвае. Але на адной з буйных кацельняў Навабеліцкага раёна — РУП «Крышталь» — дзейнічае кагенерацыйная ўстаноўка расійскай вытворчасці, якая і выпрацоўвае электраэнергію. Яна ў асноўным выкарыстоўваецца на патрэбы самой кацельні, і толькі нязначная яе частка ў выглядзе лішкаў падаецца ў сеткі Мінэнерга.

— Сёлетняя зіма, Дзмітрый Аляксеевіч, была асаблівай, неардынарнай у плане холаду, нізкіх тэмператур. Натуральна, што яна стварала вашай арганізацыі шмат клопатаў. Але задачы перад калектывам былі ранейшыя: тэмпература ў кватэрах ды і нагоўл на аб'ектах сацыяльна-культурнага прызначэння не павінна быць ніжэйшай за 18 градусаў цяпла. Вы можаце сказаць, што яна была дасягнута?

— Магу. Гэта быў клопат не толькі нашага прадпрыемства, але і гарадскіх уладаў. У гарвыканкаме пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Сяргея Іванавіча Лузая штотыдзень камісія абмяркоўвала ўсе пытанні, звязаныя з цеплазабеспячэннем жыллёвага фонду ў ацяпляльны перыяд, і нейкіх сур'ёзных нараканняў у наш адрас не было.

— Магчыма, таму, што вы добра падрыхтаваліся да зімы?

— Пра адказнасць нашага калектыву ў выкананні пастаўленых задач я ўжо казаў. Падрыхтоўка ж да асенне-зімовага перыяду, як кажуць, стандартная, і яна ажыццяўляецца круглы год. Гэта — гідраўлічныя выпрабаванні ўсіх цеплавых сетак у самым пачатку сезона і падрыхтоўка кацельнага абсталявання. Горад умоўна разбіты на ўчасткі-сектары, і ў кожным з іх у пэўны час праходзяць тыя выпрабаванні. Першыя — у маі, апошнія — у жніўні. З тым разлікам, каб за месяц-паўтара да пачатку ацяпляльнага перыяду падцягнуць хвасты, якія недзе могуць вылезці. Вядома ж, усё робіцца згодна з загадзя распрацаванымі мерапрыемствамі. У планах — і рамонтныя работы на цепласетках, і іх мадэрнізацыя-рэканструкцыя, і іншае. Усё, каб менавіта за лета падрыхтаваць цеплавую гаспадарку да работы ў зімовых умовах.

— Магчыма, з'явіліся ў гэтых пытаннях нейкія новыя тэхналогіі?

— Добра, што нарэшце ў краіну прыйшлі сучасныя тэхналогіі (і мы іх прымяняем), якія дазваляюць забяспечыць эксплуатацыю цеплавых сетак на больш працяглы перыяд, у прыватнасці, у сістэме гарачага водазабеспячэння. Гэта пластыкавыя трубы з шытага поліэтылену, тэрмін службы якіх 50, а то і больш гадоў. Іх, дарэчы, вырабляе завод «Белеўратрубпласт», што знаходзіцца ў Мінскай вобласці. На гэты год мы запланавалі правесці мадэрнізацыю 19,3 кіламетра цеплавых сетак, на што будзе зрасходавана каля дзесяці мільярдаў рублёў.

— Пры ўсім сказаным вамі, Дзмітрый Аляксеевіч, складаецца ўражанне, што работа калектыву — без сучка-задзірынкі, што ўсё добра, ідэальна было ў зімовы перыяд...

— Катэгарычна я так не сцвярджаю, бо зімой, вядома ж, з розных прычын не абышлося без нейкіх, хай сабе і нязначных, але ўсё ж аварый. Мы іх стараліся (і гэта нам удавалася) ліквідаваць на працягу трох-чатырох гадзін. Заўважу пры гэтым, што фізічны знос унутрыквартальных цеплавых сетак даволі значны — 72 працэнты, бо яны пракладзены і знаходзяцца ў адным канале з гарачаводнымі сеткамі, якія з-за сваёй спецыфікі маюць невысокі (сем-восем гадоў) тэрмін эксплуатацыі. Калі выходзяць яны са строю, то змяншаецца і тэрмін эксплуатацыі сістэм ацяплення.

— Напэўна, у такіх выпадках задзейнічаны аварыйныя брыгады?

— А як жа. Без іх не абыдзешся ніяк. Дзяжурныя брыгады працуюць летам у начны час, а ў ацяпляльны перыяд — кругласутачна.

— А як выяўляюцца парывы труб?

— Практыкуецца абход цеплавых сетак, ёсць спецыяльныя прыборы, якія з дакладнасцю да аднаго метра фіксуюць тыя парывы. Калі ў камеры выяўлена вада, паступае адпаведны сігнал у аварыйную службу, начальніку вытворчасці, і пачынаецца высвятленне прычын яе з'яўлення. У вясновы перыяд, калі растае снег, часта яна паступае туды з-за высокага ўзроўню грунтавых водаў у асобных раёнах. Таму, каб высветліць, што ж адбылося ў сапраўднасці, бяруцца пробы вады, вызначаецца яе жорсткасць, і калі гэта вада сеткавая, а не грунтавая, то адшукваецца месца парыву трубы. Астатняе — вядома.

Мадэрнізацыя цеплавых сетак.

— Нам, Дзмітрый Аляксеевіч, вядомыя выпадкі, калі ў асобных жылых дамах усё ж бывалі перабоі з цяплом. Чым гэта магло быць выкліканa?

— Тут ёсць некалькі фактараў, якія ў куды большай меры звязаны не з работай агульнай сістэмы цеплазабеспячэння, а з іншымі прычынамі. Недзе з-за канструкцыйных асаблівасцяў дамоў, у свой час пабудаваных па адпаведных тэхналогіях...

— Маеце на ўвазе панэльныя дамы, у якіх батарэі напалову аддаюць цяпло вуліцы?

— Правільна. Вось і такое пытанне: а ці ўсе кватэранайманьнікі ўцяпляюць вокны і дзверы, што яны павінны рабіць? Ёсць таксама і асобныя праблемы цеплазабеспячэння ў стаяках у кватэрах некаторых жыхароў, бо знаходзяцца так званыя ўмельцы, якія то ўцепляць самаробна падлогу, то выведуць без дазволу батарэі ацяплення на балкон, то ўсярэдзіне кватэры навесяць дадаткова ацяпляльныя секцыі. Ніхто з іх пры гэтым не задумваецца, што тым самым парушаецца разліковая схема цеплазабеспячэння, гідраўлічная сістэма дома і стварае на пэўных стаяках большае супраціўленне, а вада, як і электрычны ток, праходзіць там, дзе ёй лягчэй прайсці, дзе меншае супраціўленне. Адпаведна той чалавек не паляпшае ацяпленне будынка, а пагаршае.

— Але ж ён паляпшае для сябе, для сваіх карыслівых мэтаў. Ці не так?

— Не, не так. Бо той парушальнік толькі мяркуе, што робіць для сябе лепш і не разумее адваротнае. Яго пераробкі выклікаюць павелічэнне супраціўлення па ўсім стаяку, і таму вада пойдзе ў іншыя стаякі, і ён не атрымае большага цяпла. Калі ж выводзіць батарэі ацяплення ўсярэдзіне кватэры з панэлі або навешваць дадатковыя секцыі ацяплення, трэба рабіць гэта па праекце, бо тут трэба быць спецыялістам, каб разлічыць дакладна, як і колькі, каб не парушыць агульную цыркуляцыю вады па стаяках. Вядома, што лепш рабіць гэта комплексна, і мяркую, што калі-небудзь гэта будзе.

— Ці аказвае ваша прадпрыемства платныя паслугі насельніцтву?

— І не толькі яму, але і суб'ектам гаспадарання, юрыдычным асобам. У нас можна заказаць транспарт, краны, экскаватары, іншую тэхніку, мы аказваем паслугі па адпампоўванні сцёкаў, рамантуем і манціруем сістэмы ацяплення ў прыватных дамах, вырабляем усялякія металічныя канструкцыі па эскізах заказчыкаў, выконваем такарныя работы і г.д. Спектр такіх паслуг даволі вялікі.

— Вашы планы і задачы на гэты год?

— Мінулы мы закончылі, як ужо было сказана, паспяхова, справіўшыся з усімі даведзенымі паказчыкамі. Сёлета ж патрэбна замяніць 19,3 кіламетра цеплавых сетак, павялічыць інвестыцыі ў асноўны капітал, забяспечыць большы аб'ём платных паслуг і большую эканомію энергарэсурсаў і г.д.

Яшчэ раз хачу сказаць пра наш калектыў, якому па сілах пастаўленыя задачы. У яго традыцыях — раўненне на лепшых, на перадавікоў, якія за ўдарную працу маюць ганаровыя граматы прадпрыемства, упраўлення і Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Савета Міністраў, урадавыя ўзнагароды. Сярод іх — галоўны інжынер Навум Чарняўскі, машыніст экскаватара Юрый Чыжоў, начальнік рамонтна-эксплуатацыйнага цэха № 3 Фелікс Катоўнікаў, слесар Віталь Каліннкін, вадзіцель Аляксандр Шляхценка. Дык ўсіх ці пералічыш? З надыходным прафесійным святам, калегі! Моцнага здароўя вам і вашым сем'ям, веснавога настрою, дабрабыту!

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Ліцэнзія № 02300/0474260
Дзяржпрамнагляду МНС
Рэспублікі Беларусь. УНП 400051836

**КВУП «Гомельаблцепласетка»
246007, г. Гомель,
вул. Шылава, 6
тэл./факс 57 36 94**

Дзяржаўны інтарэс

Адна з кацельных прадпрыемства (кацельная зала).

Каманда спартсменаў КПУП «Гомельаблцепласетка».

Падпіска-2010

Віцебскія шчасліўчыкі

Падпісная кампанія на 2 квартал і першае паўгоддзе 2010 года яшчэ ў самым разгары. Таму і некаторыя журналісты «Звязды» зараз ледзь не штодня ў дарозе — развозяць прызы сваім падпісчыкам, паштальёнам і кіяскёрам.

Чарговы «падпісны» выезд быў скіраваны ў Віцебскую вобласць і меў статус стратэгічнага. Яшчэ б — на гэты раз адразу два суперпрызы трапілі ў гэты рэгіён: двухкамерны халадзільнік «Атлант» — у Верхнядзвінск і каляровы тэлевізар «Віцязь» — у Віцебскі раён. І яшчэ шэраг драбнейшых прызоў па ўсім маршруце, які ўмясціў у сябе дзясятак раённых і гарадскіх цэнтраў...

У Докшыцах мы пажадалі далейшых поспехаў нашаму даўняму падпісчыку Валерыю Шылу, які ў штоквартальнай звяздоўскай латарэі выйграў электрафен. Праўда, падарунак свой паспеў забраць яшчэ ў рэдакцыі...

Халадзільнік прывезлі! Нашы падпісчыкі Людміла і Васіль БЕЛАВУСЫ сустракаюць на сваім падворку галоўны прыз латарэі «Звязды».

А вось жыхарка Шаркоўшчыны Зоя Морхат свой прыз — пыласос «Самсунг» — вырашыла дачакацца. І, пэўна, не прагадала, бо атрымала яго ў раённым цэнтры на пошце ў прысутнасці яе адказных работнікаў і кіраўніцтва раённай «вертыкалі». Мы былі ўпэўненыя, што ў вёску Залесін, дзе жыве наша падпісчыца, яна вярнулася ў вельмі добрым настроі.

Усмешкі і добры настрой панавалі ў актавай зале Верхнядзвінскага райвыканкама. У чаканні халадзільніка прысутныя ў зале людзі, магчыма, задаваліся пытаннем: а ці будзе ён? Але ж калі журналісты «Звязды» з'явіліся ў зале, то ўсе магчымыя сумненні адпалі. Новаспечаная ўладальніца суперпрызa Людміла Белавус, якая верная газеце ўжо не адзін дзясятак гадоў, расказала пра старэйшае ў краіне беларускамоўнае выданне ў самых цёплых словах, пажадала ўсім прысутным поспехаў і ўдачы. І трэба сказаць, што ўдача ў гэты вечар наведала многіх. Падчас правядзення віктарыны на веданне гісторыі газеты «Звязда» народ вельмі актыўна даваў правільныя адказы, за што і быў узнагароджаны фірмовымі сувенірамі ад газеты.

На пытанні віктарыны Звязды паспяхова адказала начальнік Верхнядзвінскага раённага вузла паштовай сувязі Алена КАВАЛЕЎСКАЯ. Бейсболка з лагатыпам «Звязды» – прыз пераможцы.

(Працяг будзе.)

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Мінск — Докшыцы — Глыбокае — Шаркоўшчына — Міёры — Верхнядзвінск — Полацк — Наваполацк — Шуміліна — Віцебск — Бешанковічы — Лепель — Мінск.

Кніга былой журналісткі «Звязды» Таццяны ПАДАЛЯК «Нашчадкі вогненных вёсак» папоўніць Верхнядзвінскую бібліятэку. Гэты прыз атрымала дырэктар бібліятэкі Ала ГЕНДЗІК.

Зоя МОРХАТ з Шаркоўшчыны атрымала прыз нашай газеты з рук начальніка мясцовага вузла паштовай сувязі Кацярыны РУТКОЎСКАЙ.

Рэверс з сецiва

ПАДВОЗ ВУЧНЯЎ — ГАЛАЎНЫ БОЛЬ ДЛЯ ДЫРЭКТАРА ШКОЛЫ

У нумары за 2 сакавіка «Звязда» змясціла артыкул Надзеі НІКАЛАЕВАЙ «Прыцягальнасць прафесіі педагога ў грамадстве імкліва зніжаецца». Услед за ім у рэдакцыю прыйшоў ліст ад настаўніка з Віцебскай вобласці, які быў апублікаваны ў нумары за 17 сакавіка. «Пакуль Міністэрства адукацыі будзе павышаць статус педагогаў на ўзроўні дэкларацый, школа страціць сапраўдных Настаўнікаў», — папярэджваў чытач. У адказ на артыкул «Самаадданасць педагогаў нельга бясконца эксплуатаваць» рэдакцыя атрымала па электроннай пошце наступныя меркаванні, некаторыя, можа, і занадта рэзкія:

@

У артыкуле калегі ўсё напісанае — чыстая праўда. Я працую ў школе з 1991 года і магу сцвярджаць, што апошнім часам стабільнасці няма. Мы займаемся ў школе ўсім, акрамя навучання дзяцей — на вучняў проста часу не застаецца. Крыху дапоўню карціну рэальнага становішча спраў. Калі за 2009 год я атрымаў 178 дакументаў уваходнай карэспандэнцыі, то за два з паловай месяцы гэтага года — ужо 97, і гэта не ўсе зарэгістраваныя. Правяраюць школу ўсе запар. Прыехала міліцыя паглядзець графік работы гурткоў, які з іншай інфармацыяй мы адпраўляем у РАУС, і не ўбачыўшы, што гурток у дадзены момант працуе, адразу пішуць дакладную ў вобласць, а пацікавіцца ў дырэктара або кіраўніка гуртка, чаму гурток не праводзіцца, ніхто не жадае. «Адно акно» і адміністрацыйныя працэдуры — асобная размова. Штомесячная справаздача і вядзенне вялікай колькасці непатрэбных журналаў... Калі прыходзіць чалавек са зваротам або прапановай, трэба зрабіць запіс у журнал прыёму па асабістых пытаннях, запатрабаваць у яго пашпарт, падабраць зручны час, прызначыць прыём, зрабіць запісы ў журнале вусных або пісьмовых зваротаў, і ўсё гэта замест таго, каб вырашыць пытанне за 5 хвілін з запісам у журнал выходнай карэспандэнцыі.

Падвоз вучняў у школу і дзіцячы сад таксама складанае пытанне, якое трымае ў пастаянным напружанні. Вадзіцелю трэба выехаць з гаража ў 6.50, але да гэтага часу ён павінен прайсці перадрэйсавы медыцынскі агляд, а гэта значыць, што медыку дзеля аднаго чалавека трэба прыйсці на работу ў 6.30, каб зрабіць допуск. Механіку сельгаспрадпрыемства, з якім заключаны дагавор, трэба прыйсці ў 6.15 і правесці перадрэйсавы тэхнічны агляд аўтобуса. Да школы ім трэба дабірацца самастойна больш як 3 кіламетры. За воратамі школы вадзіцеля «ласкава» сустракае інспектар з Мінтранса і просіць прад'явіць дакументы з выпісанай дырэктарам раніцай пуцёўкай з усімі допускамі. Скажыце, ці рэальна гэта зрабіць?! Унеслі ў функцыянальныя абавязкі настаўніка пункт аб суправаджэнні дзяцей пры перавозцы, а педагогу дабрацца да школы трэба да 6.50, затым праехаць увесь маршрут (110 км за дзень), правесці свае ўрокі, напісаць кучу папер. У аўтобусе толькі 23 пасадачныя месцы, а ў населеным пункце за 7 км ад школы — 27 дзяцей. І як іх прывезці на заняткі, не парушыўшы патрабаванні Мінтранса? Інструкцыі па перавозцы дзяцей у дзіцячы сад увогуле няма, бацькі павінны прывозіць дзяцей у сад і асабіста перадаваць іх выхавальніку, таму нам даводзіцца ехаць за бацькамі, каб тыя пасадзілі на рукі сваіх дзяцей (а калі іх трое?), прывезці і бацькоў, і дзяцей у сад, а затым даставіць дарослых дадому, бо кожнаму трэба ісці на працу. Далей кіроўца павінен займацца абслугоўваннем і рамонтам аўтобуса, не маючы спецыяльнага абсталявання і адпаведнай падрыхтоўкі, а дырэктар павінен правесці інструктаж і выдаць кіроўцу допуск для правядзення рамонту, а ён жа педагог, а не механік. Рабочы дзень кіроўцы аўтобуса ў нашай школе доўжыцца з 6.15 да 18.15 з перапынкам на абед з 12.00 да 13.00. У суботу — шосты школьны дзень, таму і ў кіроўцы — таксама рабочы дзень, а выхадны — толькі ў нядзелю. Зарплата кіроўцы школьнага аўтобуса, які працуе на 1,5 стаўкі, складае 600 тысяч рублёў. Акрамя таго, практычна кожны тыдзень забіраюць аўтобус на розныя мерапрыемствы па лініі райвыканкама, раённага аддзела адукацыі, здараецца, што даводзіцца працаваць і ў нядзелю. Знайсці кіроўцу для школьнага аўтобуса ў сельскай мясцовасці з усімі катэгорыямі і трохгадовым стажам, згоднага на такія заробкі пры вялікай адказнасці, практычна немагчыма. Ёсць арганізацыі, якія займаюцца пасажырскімі перавозкамі, вось яны і павінны займацца перавозкамі вучняў, а не дырэктар школы. А ў нас як усё робіцца: закрылі школу, выдзелілі аўтобусы для падвозу вучняў і на гэтым праблему быццам бы вырашылі, а што далей рабіць дырэктару з гэтым аўтобусам, не парушыўшы шматлікія інструкцыі?

Збор грошай на розныя мэты — яшчэ адзін эпізод, які наш калега не закрануў у сваёй публікацыі, хіба што ў іх школе няма абавязковых латарэй, «добраахвотных» адлічэнняў у фонд міру, Чырвоны крыж, АСВОД, за адпрацаваныя суботнікі (рэспубліканскі, абласны, раённы), на падтрымку сельгасвытворцаў, на сустрэчу правяральшчыкаў і правядзенне розных школьных і пазакласных мерапрыемстваў.

Для выплаты штрафаў увогуле трэба закладваць асобны артыкул у прэміраванні настаўнікаў. Прыехала санстанцыя з комплекснай праверкай, і яе супрацоўнік нам кажа: «Як я пасля комплекснай праверкі паеду без штрафу? Мяне кіраўніцтва не зразумее...» Вось і плацім штрафы санслужбе за не адчыненую своечасова фортку або за пыл за шафай. Газета «Юны выратавальнік», напэўна, самая масавая газета, бо выпісваецца за кошт класных кіраўнікоў і дзяцей. Даходзіць да абсурду: у суседняй пачатковай школе толькі 4 вучні, а па даведзеным плане трэба выпісаць 6 газет.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

Па платных агульнаадукацыйных паслугах таксама пастаянна даводзяць да школы план, хоць у Міністэрстве адукацыі і кажуць, што ніякіх планаў не існуе. Якія платныя адукацыйныя паслугі мы можам аказваць, калі не да канца выкарыстоўваюцца гадзіны вучэбнага плана, не кажучы пра магчымасці выкладчыкаў і зарплаты працаўнікоў сяла. І так можна працягваць па кожным пункце з жыцця школы (факультатывы, 10-бальная ацэнка ведаў, харчаванне, забеспячэнне падручнікамі, абсталяваннем, мэбляй, шосты школьны дзень і г.д.). Робіцца шмат добрага, але не даводзіцца ўсё гэта да лагічнага канца. А для праверак мы ўжо навучыліся складаць справаздачы і пускаць «кантралёрам» пыл у вочы, бо жыццё нас прымушае...

Дырэктар адной са школ Віцебскай вобласці.

P.S. ***«Звязду» чытаю пастаянна і паважаю газету не толькі за тое, што мае бацькі выпісваюць яе вельмі даўно, але і за вострыя тэмы , што ўзнімаюцца на яе старонках, за тое, што журналісты не баяцца друкаваць нязручную для многіх інфармацыю.***

@

Я адпрацаваў у школе шмат гадоў, але такога беспарадку ў адукацыі яшчэ не было. Праблемы ўзнікалі заўсёды, і іх трэба было вырашаць. Але зараз праблемы ствараюцца кіраўнікамі ўсіх мясцовых рангаў для таго, каб паставіць педагогаў у такое становішча, каб ні іх дзеці, ні іх лепшыя вучні нават не думалі атрымліваць прафесію настаўніка. Ды так ужо і ёсць — паглядзіце, хто ідзе працаваць у школу. Працаваць ідуць тыя, каму няма куды пайсці, у каго няма іншага варыянта, акрамя школы. Я ўжо не кажу пра нізкія заробкі, бо пра гэта гаварылася неаднойчы. Хачу сказаць пра ўмовы працы. Галіной адукацыі і настаўнікамі ў прыватнасці кіруюць абсалютна ўсе. Часам прыязджае чыноўнік, якога апошні раз праблемы адукацыі хвалявалі хіба што на яго выпускным вечары, і пачынае выказваць сваё меркаванне. Нават у сваёй роднай школе настаўнік не мае права выказаць свае думкі, калі яны не супадаюць сама меней з меркаваннем дырэктара школы. А калі асмеліўся ўсё ж выказаць сваю пазіцыю, то цябе тут жа паставяць на месца словамі: «У вас кантракт заканчваецца ў гэтым годзе, будзем думаць, ці працягнуць яго...» Уся работа ў школе заключаецца ў тым, каб правільна афарміць паперкі, і нікога не цікавіць сам вучэбны працэс. Ды і веды цяпер не асабліва патрэбныя, паколькі школе даводзяць план паступлення выпускнікоў у прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, а там, як вядома, веды не патрэбныя...

Канстанцін.

@

Працую ў школе, таму магу сцвярджаць, што кожнае сказанае слова — абсалютная праўда. Крыўдна і прыкра. Не могуць людзі, якія адчуваюць сябе непаўнавартымі, выхаваць самадастатковых людзей.

Святлана.

@

Я з'яўляюся маладым спецыялістам — настаўнікам і класным кіраўніком, і, напэўна, як і ўсе мае калегі сутыкнулася з вялікім мноствам праблем (нізкая зарплата, факультатывы, платныя адукацыйныя паслугі, забеспячэнне падручнікамі, шосты школьны дзень і г.д.) Усё гэта цалкам адбіла ў мяне жаданне заставацца пасля адпрацоўкі па разменкаванні працаваць у школе.

Таццяна.

@

Горка і крыўдна. Змяніць нічога немагчыма, таму трэба бегчы з адукацыі. Дзякуй настаўніку і газеце за смеласць!

Святлана.

@

Вось дапрацую годзік і пайду са школы. Здароўе, як кажуць, дражэй...

Яўген.

@

Дзіўна толькі, што артыкул быў адрасаваны ў газету, хоць і аўтарытэтную. Лагічна было б гэтыя думкі выкласці галіноваму прафсаюзу ці Міністэрству адукацыі.

Ал. Арк.

@

Карціна, намаляваная настаўнікам, цалкам адпавядае таму, што адбываецца ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці. Настаўнікі падобныя на загнаных коней. За свае сродкі настаўнікі павінны рыхтаваць дзяцей да алімпіяд, частаваць экзаменацыйную камісію, праводзіць конкурсы, тыражаваць раздатачныя матэрыялы. Маса папер і часу марнуецца, толькі каб дагадзіць бясконцым праверкам і камісіям. А чаму б Камітэту дзяржаўнага кантролю не праверыць абласныя і раённыя ўпраўленні і аддзелы адукацыі на прадмет таго, наколькі яны адцягваюць увагу і перашкаджаюць настаўнікам працаваць.

Генадзь Аляксеевіч.

@

За тое, што я адмовілася аддаваць у фонд «школьных заробкаў» свае грошы (70 тысяч рублёў) дырэктар школы пазбавіў мяне прэміі. Цікава, чаму я павінна са сваёй зарплаты купляць фарбу для рамонту школы, зарабляць для Міністэрства адукацыі грошы на платных адукацыйных паслугах, калі Міністэрства адукацыі пазбавіла мяне права кампенсацыі за праезд на работу? Я жыву за 30 кіламетраў ад месца працы, а працую ў сельскай школе. На праезд штомесяц ідзе каля 120 тысяч з лішкам рублёў. Мая зарплата зараз складае 550 тысяч рублёў. І як, скажыце, мне пражыць на тыя «шчаслівыя» 400 тысяч рублёў? А калі падпісацца на газеты, то на 250 тысяч рублёў, якія застаюцца у мяне пасля аплаты дзіцячага сада і камунальных паслуг? А ў школе кажуць: «Не падабаецца? Звальняйцеся...»

Марына.

@

Мінскія магазіны «Еўраопт» запрашаюць на працу прыбіральшчыц і дворнікаў з заробкамі 650 тысяч рублёў. А нам, настаўнікам, даводзіцца працаваць за 480 тысяч рублёў!

Віталь СІТНІК.

Калі вам ёсць што сказаць па праблемах школы, далучайцеся да дыскусіі: пішыце ў рэдакцыю або пакідайце свае меркаванні на нашым сайце www.zviazda.by. Вынікі дыскусіі мы падвядзем сумесна з Міністэрствам адукацыі і галіновым прафсаюзам.

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь участка, га	Наличие ограничений в использовании	Расходы по подготовке документ.	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Мостище, участок № 10, № 623287606101000100	0,1926		1 357 724	7 704 000	770 000
2	д. Мостище, участок № 11, № 623287606101000104	0,1826		1 357 724	7 304 000	730 000
3	д. Мостище, участок № 12, № 623287606101000105	0,2048		1 357 724	8 192 000	820 000
4	д. Молоди, участок № 6, № 623287605101000052	0,1970		1 478 834	7 880 000	790 000
5	д. Молоди, участок № 7, № 623287605101000070	0,1840		1 357 724	7 360 000	740 000
6	д. Кроква, участок № 1, № 623287603101000049	0,1500	водоохранная зона ручья	1 357 724	1 500 000	150 000
7	д. Цна, участок № 4, № 623287609601000024	0,1841	водоохранная зона р. Цна	1 477 834	11 046 000	1 100 000
8	д. Цна, участок № 5, № 623287609601000025	0,2177	водоохранная зона р. Цна	1 477 834	13 062 000	1 300 000

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **27 апреля 2010 г. в 14.00** по адресу: д. Швабы, ул. Парковая, д. 26 Логойского района Минской обл. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 21 апреля 2010 г.**

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, (+375 29) 107 16 17.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.

Фонд «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» вносит изменения в извещение о проведении аукциона, опубликованное в газете «Звязда» от 12 марта 2010 г. № 45, в части изменения начальной цены предметов аукциона по лотам №№ 1–3, который назначен на 15 апреля 2010 г. в 11.00:

Лот № 1	**Начальная цена предмета аукциона** (Лот № 1): 81 408 344 рубля (в том числе: объект – 78 738 410 рублей, право аренды земельного участка – 2 669 934 рубля). Размер задатка для участия в аукционе – 8 000 000 рублей.
Лот № 2	**Начальная цена предмета аукциона** (Лот № 2): 55 708 215 рублей (в том числе: объект – 49 986 711 рублей, право аренды земельного участка – 5 721 504 рубля). Размер задатка для участия в аукционе – 5 000 000 рублей.
Лот № 3	**Начальная цена предмета аукциона** (Лот № 3): 495 210 250 рублей (в том числе: объекты – 490 356 379 рублей, право аренды земельного участка – 4 853 871 рубль). Размер задатка для участия в аукционе – 49 000 000 рублей.

Организация:
ОАО «ДРОЖЖЕВОЙ КОМБИНАТ»
Учетный номер плательщика: УНП 100104781.
Вид деятельности: **производство дрожжей**
Организационно-правовая форма:
Орган управления: **концерн «Белгоспищепром»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **г. Минск, ул. Октябрьская, д. 14**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 г.

Актив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	21 086	25 321
амортизация	102	6 437	7 904
остаточная стоимость	110	14 649	17 417
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	6	7
амортизация	112	2	2
остаточная стоимость	120	4	5
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	-	-
амортизация	122	-	-
остаточная стоимость	130	-	-
Вложения во внеоборотные активы	140	803	879
В том числе: незавершенное строительство	141	431	673
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**15 456**	**18 301**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	13 920	14 525
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	4 272	4 925
животные на выращивании и откорме	212	-	-
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	-	-
расходы на реализацию	214	370	220
готовая продукция и товары для реализации	215	852	729
товары отгруженные	216	7 795	7 729
выполненные этапы по незавершенным работам	217	-	-
расходы будущих периодов	218	631	922
прочие запасы и затраты	219	-	-
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	3 295	3 281
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	-	-
В том числе: покупателей и заказчиков	231	-	-
прочая дебиторская задолженность	232	-	-
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	553	455
В том числе: покупателей и заказчиков	241	295	-
поставщиков и подрядчиков	242	188	177
по налогам и сборам	243	40	55
по расчетам с персоналом	244	15	9
разных дебиторов	245	15	214
прочая дебиторская задолженность	249	-	-
Расчеты с учредителями	250	1	1
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	1	1
прочие	252	-	-
Денежные средства	260	501	189
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	-	-
Финансовые вложения	270	61	58
прочие оборотные активы	280		276
ИТОГО по разделу II	**290**	**18 331**	**18 785**
БАЛАНС (190 + 290)	**300**	**33 787**	**37 086**
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	2 442	3 967
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	420	37	37
В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	37	37
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	-	-
Добавочный фонд	430	5 207	6 399
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	-
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	- 11 074	- 13 427
Целевое финансирование	460	71	393
Доходы будущих периодов	470	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**- 3 317**	**- 2 631**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	11 231	13 855
Прочие долгосрочные обязательства	520	264	264
ИТОГО по разделу IV	**590**	**11 495**	**14 119**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	5 061	5 114
Кредиторская задолженность	620	20 546	20 482
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	19 632	19 554
перед покупателями и заказчиками	622	99	54
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	293	312
по прочим расчетам с персоналом	624	5	5
по налогам и сборам	625	383	439
по социальному страхованию и обеспечению	626	87	44
по лизинговым платежам	627	-	41
перед прочими кредиторами	628	47	33
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	2	2
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	2	2
прочая задолженность	632	-	-
Резервы предстоящих расходов	640	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**25 609**	**25 598**
БАЛАНС (490 + 590 + 690)	**700**	**33 787**	**37 086**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	-	-
краткосрочная кредиторская задолженность	702	20 546	20 441

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	615	-
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	-	-
Материалы, принятые в переработку	003	-	-
Товары, принятые на комиссию	004	-	-
Оборудование, принятое для монтажа	005	-	-
Бланки строгой отчетности	006	-	-
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	-	-
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008	-	-
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	1 573	3 085
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011	-	-
Нематериальные активы, полученные в пользование	012	-	-
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	-	-
Потеря стоимости основных средств	014	-	-
